ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

ЛЮТЫ 26 1933 г.

№ 45 (4589)

Год выданьня XVI

Пад знакам разгорнутай бальшавіцкай самакрытыкі

Да вынікаў аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б

Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б, які закончыўся гэтымі днямі, адзначае значны паварот у жыцьці і рабоце партыйных арганізацый БССР.

Знаменьне пленуму ў тым, што ён з усёй бальшавіцкай прастатой, на падставе пасьлядоўнай і рашучай самакрытыкі, ускрыў рад сур'ёзных недахопаў і памылак у дзейнасьці савецкага і гаспадарчага апарату і рабоце партыйных арганізацый. Гэтыя недахопы і памылкі з усёй відавочнасьцю выявіліся ў перыяд сельска-гаспадарчых загатовак, значна затармазіўшы і ўскладніўшы іх ход, стварыўшы сур'ёзную пагрозу зрыву выкананьня загатоўчых плянаў, і знайшлі правільную суровую ацэнку ў пастанове ЦК УсеКП(б), канстатаваўшай гніла-лібэральныя адносіны партыйнай арганізацыі да важнейшых задач і пастаноў партыі.

У чым заключаюцца галоўныя недахопы нашай работы? Яны заключаюцца, перш за ўсё і галоўным чынам, у невыстарчальным кіраўніцтве сельскай гаспадаркай.

Тав. Сталін у сваёй гістарычнай прамове на студзеньскім пленуме ЦК і ЦКК УсеКП(б) з незвычайнай ясьнасьцю, глыбінёй і пераканальнасьцю прааналізаваў і ўскрыў асноўныя недахопы і памылкі ў рабоце партыйных арганізацый у вёсцы, у кіраўніцтве сельскай гаспадаркай у новай абстаноўцы. **Усе гэтыя недахопы і памылкі, адзначаныя тав. Сталіным, цалкам і поўнасьцю адносяцца і да нашай беларускай партыйнай арганізацыі.**

Новая абстаноўка ў вёсцы, у сувязі з разьвіцьцём калектывізацыі, ростам пасеўных плошчаў і матар'яльна-тэхнічных сродкаў, значна **палярызавала і ўскладніла задачы кіраўніцтва** сельскай гаспадаркай, прад'яўляючы павышаныя патрабаваньні да якасьці гэтага кіраўніцтва.

Партыйная арганізацыя БССР не разумела таго, «... што калгасы ад'ю зьмяншае, а павялічвае клопаты і адказнасьць партыі і ўраду ў адносінах разьвіцьця сельскай гаспадаркі..., што партыя, калі яна хоча кіраваць калгасным рухам, павінна ўваходзіць ва ўсе дэталі калгаснага жыцьця і калгаснага кіраўніцтва..., што яна павінна ведаць усё, што адбываецца ў калгасах, каб у час прыйсьці на дапамогу і напрадзіць паяражаючыя калгасам небясьпекі». (**Сталін** — «Аб рабоце ў вёсцы»).

Мы ня ўлічылі таго, што кулак у нас эканамічна разьбіт, але яшчэ поўнасьцю недабіт і яшчэ канчаткова не страціў сваёго ўплыву ў вёсцы, што антысавецкія элементы з асяродзьдзя расфулачаных кулакоў, зруйнаваных купцоў і гандляроў, былых ураднікаў, стражнікаў, шматлікіх балахоўцаў і прыхільнікаў дробна-буржуазных партый, галоўным чынам эсэраў, — ня выніклі з зямлі і сваёй зброі поўнасьцю ня склалі, што гэтыя элементы, пралазячы ў калгасы, ня могуць ня шкодзіць савецкай уладзе і калгаснаму буданіцтву. Гэта з поўнай відавочнасьцю і ясьнасьцю было ўскрыта ў перыяд загатовак.

Мы ня здолелі таксама правільна спалучыць работу ў калгасах з работай у адноасобным сэктары сельскай гаспадаркі, удзельная вага якога ў БССР яшчэ вельмі вялікая.

Мы ня ўлічылі таксама таго, што ва ўмовах нацыянальнай рэспублікі антысавецкія элементы і перараджэнцы з асяродзьдзя членаў партыі нямінуча паспрабуюць захаваць сваю барацьбу супроць палітыкі і пастаноў партыі пад фальшыва-нацыянальным сьцягам. Гэта патрабавала асаблівай увагі да практычнага ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі, барацьбы супроць мэханічнага яе правядзеньня.

І, нарэшце, і гэта, бадай, галоўнае, мы ня ўлічылі цяжкіх урокаў нацдэмаўшчыны і прыхільнаўшчыны, ня ўлічылі таго, што прыхільнаўшчына выкрыта і разьбіта і галоўныя яе «героі» ізаляваны, адная, прыхільнаўскія элементы ўсё-ж засталіся ў нашым апараце. Мы забылі, што прыхільнаўшчына, гэта нацдэмаўскае выданьне сталыпінщыны, пакінуўшая нам цяжкую спадчыну, нанёсшая нямала шкоды нашай палітыцы ў вёсцы, — патрабавала ад нас асаблівай пільнасьці ў кіраўніцтве сельскай гаспадаркай.

Ці была ў нас гэта пільнасьць? Сум ны вопыт паказаў, што гэтай пільнасьці ў нас ня было.

Зусім невыпадкова цэнтральным пытаньнем пленуму стала пытаньне аб рабоце Наркамзему і трактарных цэнтраў БССР. Гэтыя ўстановы зьяўляюцца непасрэднымі асноўнымі праваднікамі лініі і пастаноў партыі і савецкай улады аб рабоце ў вёсцы, яны ажыцьцяўляюць непасрэднае і практычнае кіраўніцтва сельскай гаспадаркай. Між тым гэтыя важнейшыя ўзьвены савецкага апарату аказаліся найбольш засмечанымі антысавецкімі контр-рэвалюцыйнымі эсэраўска-кадэцкімі і нацдэмаўска-прыхільнаўскімі элементамі.

Абвастрэньне клясавай барацьбы ў краіне, яраснае супраціўленьне разгромленага кулацтва актывізавала гэтыя антысавецкія элементы. Адсутнасьць бальшавіцкага кантролю і кіраўніцтва з боку кіруючых работнікаў Наркамзему і Трактарацэнтру над работай свайго апарату, фармальна-казённыя, панска-саноўныя і алілюйскія адносіны да даручанай ім партыяй адказнейшай работы прывялі да таго, што гэтыя антысавецкія элементы змаглі разгарнуць у нашых зямельных органах значную шкодніцкую работу. Яны прабавалі сарваць сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі, перашкодзіць арганізацыйна-гаспадарчаму і палітычнаму ўмацаваньню калгасаў і саўгасаў і дезарганізаваць работу МТС, як асноўных вагароў сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі.

Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК падкрэсьліў, што факты шкодніцтва ў Наркамземе і Трактарацэнтры, як і памылкі, якія выявіліся ў перыяд загатовак, у асаблівасьці нанесла рэзкае адставаньне ў загатоўках ільну, зьяўляюцца **сур'ёзнейшым палітычным урокам для ўсёй партыйнай арганізацыі БССР.**

Пленум правільна адзначыў, што шкодніцтва ў сыстэме Наркамзему і Трактарацэнтру, дрэнная работа па загатоўках і недазваляючая падрыхтоўчая работа да веснавой сяўбы гаворыць аб сур'ёзных недахопах ва ўсёй рабоце партыйнай арганізацыі, аб неабходнасьці не на словах, а на справе перабудавацца.

Важнейшым элементам бальшавіцкай перабудовы ўсёй нашай работы, і ў першую чаргу работы ў вёсцы, зьяўляецца карэнная зьмена саміх мэтадаў кіраўніцтва партыйных, камсамольскіх і савецкіх арганізацый. Неабходна рашучая барацьба з саноўна-бюракратычнымі мэтадамі кіраўніцтва асобных кіруючых работнікаў, з вычварным павятовым правадырствам, з рэшткамі сямейнасьці, групоўшчыны, якія перашкаджаюць сапраўднаму разгортваньню бальшавіцкай самакрытыкі і ажыцьцяўленьню кантролю над кожным работнікам, незалежна ад таго, які пост ён займае.

У нас яшчэ ёсьць элементы, якія да вырашэньня важнейшых пытаньняў падыходзяць ня як бальшавікі, а як абываталі, для якіх прыцельскія адносіны даражэй за прынцыповую палітыку, якія з-за прыцельскіх адносін або з з-за боязьні каго-небудзь пакрыўдзіць гатовы замаўчаць, замазаць і ўтаіць памылкі. У нас, на жаль, яшчэ нямала бясхрыбтных людзей, якія арыентацыю на правільную партыйную лінію падмяняюць арыентацыяй на адзельных асоб, якія тую ці іншую зьяву, той ці іншы факт разглядаюць ня з пункту гледжаньня прынцыпова-правільнай палітыкі, а з пункту гледжаньня адносін паміж Іванам Іванавічам і Іванам Сьцяпанавічам.

Шкодніцкая работа ў сельскай гаспадарцы магла мець месца з-за невыстарчальнай рэвалюцыйнай пільнасьці, недапушчальна слабага разгортваньня крытыкі і самакрытыкі, няўмыслнага рэшткі групоўшчыны і сямейнасьці, нікрытычнага падыходу да падбору работнікаў і адсутнасьці бальшавіцкай праверкі і ацэнкі людзей па іх канкрэтных справах, па іх штодзённай рабоце, па іх здольнасьці не на словах, а на справе змагацца за генэральную лінію партыі.

Аб'яднаны пленум аддаў таксама значную ўвагу пытаньню антывізацыі варожых нам элементаў на ідэалёгічным фронце, у галіне навукі, галоўным чынам, гісторыі і мастацкай літаратуры. Мы ня будзем спыняцца на асобных антысавецкіх вылазках у гэтай галіне, паколькі пра гэта пісалася ў «Правде» (артыкул «Пад фальшыва-нацыянальным сьцягам» у нумары ад 3 лютага), а таксама ў нашай газэце. Актывізацыя антысавецкіх і нацдэмаўскіх элементаў у галіне навукі і літаратуры цесна зьвязана са шкодніцтвам у зямельных органах. Усё гэта — зьвены аднаго ланцуга, непасрэднае адлюстраваньне абвастрэньня клясавай барацьбы ў краіне і шалёнага супраціўленьня рэшткаў кулацтва пераможнаму сацыялістычнаму наступленьню.

Гэтым вылазкам традыцыйных, права-апартуністычных і нацдэмаўскіх элементаў спрыяла таксама абстаноўка невыстарчальнай рэвалюцыйнай пільнасьці, невыстарчальнага кіраўніцтва справай нацыянальна-культурнага буданіцтва, значная засмечанасьць навуковых, культурных і выдавецкіх устаноў (Акадэмія Навук, НКА, ДВВ) клясава і ідэйна чужымі элементамі пры адсутнасьці неабходнага кантролю над іх работай з боку кіраўнікоў гэтых устаноў.

Бюро ЦК у сваёй пастанове ад 28 лістапада дало палітычную характарыстыку фактам прасочваньня ў літаратуру клясава-варожых нацыянал-дэмакратычных уплываў, раваншысцкіх вылазкам Сідарэнкі-Пенячкіна, Нікановіча і Баранавых і накідала суровыя партыйныя спагнаньні на асоб, якія непасрэдна адказваюць за стан навукова - культурных і рэдакцыйна-выдавецкіх устаноў і дапусьцілі надружаваньне антысавецкіх рэчаў. Пленум ухваліў гэту пастанову і прыняў рад мер па ўзмацненьні работы ў галіне нацыянальна-культурнага буданіцтва і ўмацаваньні ідэалёгічнага фронту.

Мы дасягнулі вялізарнейшых посьпехаў у буданіцтве беларускай культуры, нацыянальнай па форме і пралетарскай па зьместу, у рашучай барацьбе на два фронты, у барацьбе супроць вялікарускага шавінізму, як галоўнай небясьпекі ў нацыянальным пытаньні, і супроць контр-рэвалюцыйнага нацдэмакратызму. Далейшыя посьпехі ў нацыянальна-культурным буданіцтве магчымы толькі пры ўмове ўзмацненьня барацьбы супроць ухілаў ад нацыянальнай палітыкі партыі, супроць мэханічнага яе правядзеньня, якое дазваляе антысавецкім і нацыяналістычным элементам схавацца пад фальшыва - нацыянальным сьцягам.

Мы не павінны забываць цеснай сувязі паміж сялянскім пытаньнем і нацыянальным, што аслабленьне ўвагі да работы ў вёсцы цягне за сабой і аслабленьне ўвагі да правядзеньня нацыянальнай палітыкі.

Пленум ЦК і ЦКК павінен зьявіцца **паваротным момантам** ва ўсёй рабоце партыйнай арганізацыі і ў дзейнасьці савецкага і гаспадарчага апарату. Пленум паказаў узор бязьлітаснай бальшавіцкай самакрытыкі, ускрыў з усёй рашучасьцю карэньні нашых памылак і недахопаў. Вырваўшы да канца карэньні прышчэпаўшчыны, перабудаваўшы рады, рашуча выкараняючы элементы сямейнасьці і групоўшчыны ў рабоце, узмацніўшы ўвагу да падбору кадраў, ацэньваючы кожнага работніка па яго дзелавых якасьцях, па яго практычнай рабоце, змагаючыся супроць славеснадэкларацыйных адносін да генэральнай лініі партыі і яе канкрэтных пастаноў, супроць антыпартыйных ухілаў і прымірэнцтва да іх, пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б — партыйная арганізацыя БССР адзінай згуртаванай бальшавіцкай шарэнгай пойдзе наперад да новых перамог.

Тыя-ж элементы, якія прабуюць прыкрыць сваю барацьбу супроць партыі фальшыва - нацыянальным сьцягам, таксама не ад таго, каб паспэкуляваць на прыпранічным становішчы БССР, якое патрабуе нібы асьцярожнасьці, аглядак і аслабленьня ў ажыцьцяўленьні лініі партыі. З падобным маскаваньнем барацьбы супроць палітыкі партыі неабходна рашуча змагацца. У КП(б)Б ня можа быць палітыкі, якая-б чым-небудзь адрозьнівалася ад палітыкі ўсёй нашай партыі. А наша прыпранічнае становішча патрабуе не якіхсьці «аслабленьняў», а наадварот, асаблівай рашучасьці і пасьлядоўнасьці ў ажыцьцяўленьні генэральнай лініі партыі, падваеньня рэвалюцыйнай пільнасьці партыйнай арганізацыі і выключнай дысцыплінаванасьці і мабілізаванасьці ўсяго савецкага і гаспадарчага апарату.

Важнейшая задача зараз — баявая падрыхтоўка да веснавой сяўбы, бальшавіцкая арганізацыя калгасьнікаў і адноасобных бядняцка - серадняцкіх мас на выкананьне пляну далейшага ўзьдыму сельскай гаспадаркі і завяршэньне ў бліжэйшыя дні загатовак ільну.

Пленум прызнаў неадкладнымі ход падрыхтоўкі да вясны і неабходнасьць мабілізацыі ўсіх сіл, каб ва ўсеўзбраеньні сустрэць першую вясну другой пяцігодкі. Баявое апэрацыйнае кіраўніцтва з боку ўсіх вызьвеньняў партыйнага, савецкага і гаспадарчага апарату, строгая адказнасьць за даручаную справу — зарука посьпеху. Паменш канцылярыйчыны, паболш жывой практычнай справы. Не кіраваць «наогул», а кіраваць канкрэтна, ведаючы становішча ў кожным раёне, у кожным сельсавеце, у кожным калгасе і саўгасе.

Усесаюзны зьезд ударнікаў-калгасьнікаў, які закончыўся гэтымі днямі, паказаў, якім вялізарным энтузіязмам прасякнуты перадавыя масы калгасьнікаў і калгасьніц. Неабходна згуртаваць і арганізаваць гэту перадавую частку калгаснай масы і, апіраючыся на яе, дабіць рэшткі кулацтва і іх шкодніцкіх агентаў у савецкім апараце, заваяваць большасьць у калгасах, умацаваць калгасы і забясьпечыць нябывалы ўздым сацыялістычнай сельскай гаспадаркі.

Прамова тав. Сталіна на зьезьдзе калгасьнікаў, выключная па сваёй глыбіні і разам з тым прастаце, да нагляднасьці пераканаўчая, павінна быць давезена да кожнага калгасьніка. Няхай кожны калгасьнік зразумее, што ад яго самога, ад яго адносін да калгаснай працы і калгаснай маемасьці залежыць ступень яго матар'яльнага дабрабыту. Мы можам і павінны зрабіць кожнага калгасьніка, учарайшняга бедняка і серадняка, заможным. Для гэтага ў нас створаны ўсе ўмовы, усе магчымасьці.

Згуртаваўшыся чапчэ цясьней вакол ЦК УсеКП(б) і правадыра партыі, рабочых і калгасных мас, першага ўдарніка калгасаў, першага героя пераможнага сацыялістычнага наступленьня — тав. Сталіна, кампартыя Беларусі з посьпехам выканае свае задачы і ператорыць БССР у яшчэ больш магутную крэпасьць сацыялізму на заходніх рубяжы Савецкага саюзу.

Пра абавязковую пастаўку збожжа дзяржаве калгасамі і аднаасобнымі гаспадаркамі

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР і ЦК КП(б)Б

У адпаведнасьці з пастановай СНК СССР і ЦК УсеКП(б) за 19 студзеня 1933 году «Пра абавязковую пастаўку збожжа дзяржаве калгасамі і аднаасобнымі гаспадаркамі» (З. З. СССР 1933 г., № 4, арт. 25) і пастановай Савету Працы Абароны за 27 студзеня 1933 году «Пра нормы здачы дзяржаве збожжа ўраджаю 1933 году па асобных культурах» (З. З. СССР 1933 г. № 5, арт. 35), Савет Народных Камісараў БССР і Цэнтральны Камітэт КП(б)Б пастанаўляюць:

1. Скасаваць існуючую дагаворную (калятрактацыйную) сыстэму загатовак збожжавых культур і ўстанавіць для калгасаў і аднаасобных гаспадарак, маючых сілу падатку цьвёрдыя абавязацельствы па здачы збожжа дзяржаве па ўстаноўленых дзяржаўных цэнах.

2. Устанавіць наступныя, зацьвярджаныя пастановай СНК СССР ад 21 лютага 1933 г. № 263 параённыя сярэднія па ўсіх збожжавых культурах і па асобных збожжавых культурах нормы здачы калгасамі збожжа дзяржаве з ураджаю 1933 году, з равылку на кожны гэктар устаноўленага пляну пасеву яравых і на кожны гэктар фактычнага пасеву азімых збожжавых культур (у кг.):

а) Для калгасаў, якія не абслугоўваюцца МТС

РАЁНЫ	Жыта	Пшаніца	Авёс	Ячмень	Бабовыя	Крупяныя	Інш. збожжавыя культуры	Сярэдняя норма па ўсіх збожжавых культурах
1 група								
1. Аршанскі								
2. Брагінскі								
3. Віцебскі								
4. Гомельскі								
5. Заслаўскі								
6. Капыльскі								
7. Дзяржынскі								
8. Лёзьнянскі								
9. Магілеўскі	85	70	115	115	55	65	65	94
10. Менскі								
11. Мсьціслаўскі								
12. Сенненскі								
13. Слуцкі								
14. Тураўскі								
15. Чавускі								
16. Чырвона-Слабодзкі								
17. Шклоўскі								
2 група								
18. Бабруйскі								
19. Барысаўскі								
20. Буда-Кашалёўскі								
21. Бешанковіцкі								
22. Быхаўскі								
23. Бялыніцкі								
24. Вузьдзенскі								
25. Гарадоцкі								
26. Горацкі								
27. Дрысенскі								
28. Дубровенскі								
29. Касьцюковіцкі								
30. Клімавіцкі								
31. Клічаўскі	75	65	110	110	50	60	60	85
32. Крычаўскі								
33. Лагойскі								
34. Лепельскі								
35. Полацкі								
36. Пухавіцкі								
37. Рэчыцкі								
38. Рагачоўскі								
39. Расонскі								
40. Сіроцінскі								
41. Смалявіцкі								
42. Талачынскі								
43. Вушацкі								
44. Уваравіцкі								
45. Хойніцкі								
46. Чэрвеньскі								
47. Чэрыкаўскі								
3 група								
48. Асьвейскі								
49. Асіпавіцкі								
50. Бярэзінскі								
51. Веткаўскі								
52. Глускі								
53. Ельскі								
54. Жлобінскі								
55. Камарынскі								
56. Кармянскі								
57. Крупскі								
58. Лоеўскі	70	60	105	105	45	45	45	76
59. Мазырскі								
60. Парыцкі								
61. Пятрыкоўскі								
62. Прапойскі								
63. Старобінскі								
64. Тураўскі								
65. Церахаўскі								
66. Чачарскі								
67. Чашніцкі								
68. Чырвонапольскі.								
4 група								
69. Бягомльскі								
70. Жыткавіцкі								
71. Лельчыцкі								
72. Нараўлянскі	65	55	100	100	40	40	40	70
73. Любаньскі								
74. Плешчаніцкі								
75. Стара-Дароскі								
б) Для калгасаў, якія абслугоўваюцца МТС.								
Для 1 групы раёнаў	60	60	85	85	45	60	60	70
Для 2 групы раёнаў	55	55	80	80	40	50	50	65
Для 3 групы раёнаў	50	50	75	75	35	45	45	60
Для 4 групы раёнаў	45	45	70	70	30	40	40	52

Устаноўленыя ў гэтым артыкуле параённыя нормы здачы па асобных збожжавых культурах і сярэднія па ўсіх збожжавых культурах зьяўляюцца абавязковымі для ўсіх калгасаў данага раёну і ня могуць быць зьменены.

3. Колькасьць збожжа, якая павінна быць здана дзяржаве кожным калгасам, вызначаецца раённымі выканаўчымі камітэтамі на дакладнай падставе арт. 2 гэтай пастановы.

4. Устанавіць наступныя сярэднія для БССР каляндарныя тэрміны выкананьня калгасамі гадавых абавязацельстваў па здачы збожжа дзяржаве ў процантах ад пагектарных норм, устаноўленых арт. 2 гэтай пастановы.

	Жнівень	Верасень	Кастрычнік	Лістапад
Для паўднёвых раёнаў	15	35	40	10
„ цэнтральных раёнаў	12	35	45	8
„ паўночных раёнаў	5	30	55	10

Прапанаваць Упаўнаважанаму Камітэту Загатовак і НК Зямляробства не пазьней як праз 2 дні апублікаваць сьпіс раёнаў па вышэйуказаных 3-х зонах.

5. Парадак вызначэньня разьмераў здачы збожжа дзяржаве калгасамі, устаноўлены гэтай пастановай, не пашыраецца на аднаасобныя гаспадаркі. Для аднаасобных гаспадарак захоўваецца існуючы цяпер парадак вызначэньня разьмераў збожжаздачы, а імен на: сельскія саветы ўстанаўляюць для кожнай аднаасобнай гаспадаркі цьвёрдыя абавязацельствы па здачы збожжа дзяржаве, выходзячы з фактычна засеянай плошчы азімых і цьвёрдага пляну сяўбы яравых збожжавых культур, устаноўленага сельскім саветам для кожнай аднаасобнай гаспадаркі, а таксама выходзячы з таго, каб здача з га аднаасобнымі гаспадаркамі была на 5-10 проц. вышэй норм, устаноўленых для калгасаў данага раёну як па асобных збожжавых культурах, так і сярэднія па ўсіх збожжавых культурах.

6. Для аднаасобных гаспадарак устанавіць граничны тэрмін поўнага выкананьня ўстаноўленых для іх гадавых пляну збожжаздачы — 1 лістапада 1933 г.

Тэрміны здачы збожжа па асобных зонах устанавіць:

	Жнівень	Верасень	Кастрычнік
Для раёнаў паднёвай зоны . .	25	60	15
„ „ цэнтральнай зоны . .	20	70	10
„ „ паўночнай зоны . .	15	70	15

7. Захаваць існуючыя цэны на збожжа, якое здаецца дзяржаве.

8. Абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты не пазьней 15 сакавіка 1933 г. уручыць кожнаму калгасу абавязацельствы па здачы збожжа па культурах з указаньнем тэрміну яго выкананьня.

Да гэтага-ж тэрміну ўручыць кожнай аднаасобнай гаспадарцы абавязацельствы па здачы збожжа дзяржаве з указаньнем разьмераў здачы па кожнай культуры паасобку, а таксама тэрміны выкананьня ўсяго заданьня.

9. Пры здачы збожжа дзяржаве калгасамі і аднаасобнымі гаспадаркамі дапускаецца замена адной культуры другой (проса замест грэчкі і наадварот).

Не дапускаецца толькі замена харчовых культур — пшаніцы і жыта фуражнымі і крупянымі, а таксама не дазваляецца замена пшаніцы ніякай іншай культурай.

10. Калгасы і аднаасобныя гаспадаркі павінны падвесьці і здаць па элеватары або прыстанцыйныя і прыстаньскія склады Загатзбожжа тую колькасьць збожжа, якая належыць з іх, а загатоўчыя органы павінны захаваць існуючую практыку разьлікаў за здатчыкам збожжа з улікам дальнасьці падвозу.

11. У залік выкананьня калгасамі і аднаасобнымі гаспадаркамі сваіх абавязацельстваў устаноўленых гэтай пастановай па здачы збожжа дзяржаве, прымаецца толькі збожжа добраякаснае.

Тухлае і праросшае збожжа не залічваецца ў выкананьне абавязацельстваў калгасаў і аднаасобных гаспадарак.

Засьмечанае і сырое збожжа залічваецца ў выкананьне абавязацельстваў са скідкай на засьмечанасьць і вільготнасьць па стаўках, устаноўленых Камітэтам Загатовак пры СНК СССР.

Абавязаць загадчыкаў элеватарамі і ссыпнымі пунктамі прыцягваць да судовай адказнасьці асоб, вінаватых у спробе здаць дзяржаве збожжа яўна нядобраякаснае або сапсаванае збожжа.

12. Для снабжэньня хлебам по цьвёрдых дзяржаўных цэнах сельскіх настаўнікаў, агранамаў і мэдработнікаў устанавіць абавязковае залічэньне ў разьмеры 2 проц. ад норм, вызначаных гэтай пастановай.

Збожжа ў лік гэтых залічэньняў зацьвердзіць палітычную камісію ЦК у складзе т. т. ШАРАНГОВІЧА (старшыня), РАЧЫЦКАГА (з заменай РЭВІНСКІМ), КАРТУКОВА, ГЕРЦОВІЧА (ЦК ЛКСМБ), ЛЕНЦНЭРА, ЛІСКОВІЧА (ЦСПСБ).

5. Даручыць камісіі ЦК не пазьней 27 лютага ўстанавіць колькасьць дэлегатаў ад кожнага раёну, зацьвердзіць і разаслаць усім ГК і РК падрабязнае ўказаньне аб правядзеньні масавай палітычнай работы, вызначыць канкрэтныя задачы для друку, прафсаюзаў, камсамолу, Дзяржвыдавецтва, Белдзяржкіно і інш. арганізацый, вырашыць фінансавае пытаньне, таксама падабраць і канчаткова зацьвердзіць упаўнаважаных ЦК па падрыхтоўцы да зьлётаў і дакладчыкаў па буйнейшых і найбольш важных раёнах. Дакладчыкамі па ўсіх іншых раёнах лічыць сакратароў РК.

6. Прапанаваць усім ГК і РК КП(б)Б не пазьней 27 лютага арганізаваць пры РК камісіі па падрыхтоўцы да зьлётаў у складзе: заг. арганвідзелам ГК, РК (старшыня), заг. райза, сакратара ГК-РК ЛКСМБ і ўпаўнаважанага ЦК, на якіх ускладаецца поўная адказнасьць за падрыхтоўку і арганізацыю зьлётаў.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГІКАЛО.

Для 1 групы раёнаў 60 60 85 85 45 60 60 70
Для 2 групы раёнаў 55 55 80 80 40 50 50 65
Для 3 групы раёнаў 50 50 75 75 35 45 45 60
Для 4 групы раёнаў 45 45 70 70 30 40 40 52

Збожжа ў лік гэтых залічэньняў

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР
М. ГАЛАДЗЕД.
Сакратар ЦК КП(б)Б
М. ГІКАЛО.

АБ ПРАВЯДЗЕНЬНІ РАЁННЫХ ЗЬЛЁТАЎ КАЛГАСЬНІКАЎ-УДАРНІКАЎ ЛЕПШЫХ КАЛГАСАЎ

Пастанова Цэнтрапасеўкому ад 25 лютага 1933 г.

1. Склікаць з 7 па 10 сакавіка г. г. зьлёты калгасьнікаў-ударнікаў перадавых калгасаў.

Зацьвердзіць наступны парадак дня зьлётаў:

Даклад аб арганізацыі веснавой сяўбы і разгортваньні сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў калгасах.

2. Прапанаваць ГК і РК КП(б)Б, ЦК ЛКСМБ, прафсаюзным і зямельным арганізацыям усю падрыхтоўку і зьлёты правесьці як шырокую масавую палітычную кампанію, якая-б забясьпечвала мабілізацыю калгасных мас на ажыцьцяўленьне пастаноў пленуму ЦК УсеКП(б), прамовы тав. СТАЛІНА аб рабоце на вёсцы і пастаноў усесаюзнага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў, — на сапраўднае разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў кожным калгасе, брыгадзе і паміж калгасьнікамі ў справе лепшай арганізацыі веснавой сяўбы, на бязьлітасную барацьбу за захаваньне калгаснай і дзяржаўнай маемасьці, супроць кулацкіх і клясава-варожых элемэнтаў, гультаёў, дармаедаў і рвачоў.

3. Паказаць усім РК і ГК КП(б)Б, што на зьлёты выбіраюцца лепшыя ўдарнікі-калгасьнікі, галоўным чынам, брыгадзіры, пераважна працуючыя непасрэдна на вытворчасьці і толькі перадавымі калгасамі, паказаўшымі лепшыя прыклады ў справе выкананьня сваіх абавязкаў перад дзяржавай, у падрыхтоўцы да веснавой сяўбы, укараненьні агразоатэхнікі, павышэньні ўраджайнасьці і разьвіцьці жывёлагадоўлі, барацьбы за моцную калгасную дысцыпліну, захаваньне калгаснай маемасьці і ачыстку ад кулацкіх і чужых элемэнтаў.

4. Для кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеньнем зьлётаў зацьвердзіць палітычную камісію ЦК у складзе т. т. ШАРАНГОВІЧА (старшыня), РАЧЫЦКАГА (з заменай РЭВІНСКІМ), КАРТУКОВА, ГЕРЦОВІЧА (ЦК ЛКСМБ), ЛЕНЦНЭРА, ЛІСКОВІЧА (ЦСПСБ).

5. Даручыць камісіі ЦК не пазьней 27 лютага ўстанавіць колькасьць дэлегатаў ад кожнага раёну, зацьвердзіць і разаслаць усім ГК і РК падрабязнае ўказаньне аб правядзеньні масавай палітычнай работы, вызначыць канкрэтныя задачы для друку, прафсаюзаў, камсамолу, Дзяржвыдавецтва, Белдзяржкіно і інш. арганізацый, вырашыць фінансавае пытаньне, таксама падабраць і канчаткова зацьвердзіць упаўнаважаных ЦК па падрыхтоўцы да зьлётаў і дакладчыкаў па буйнейшых і найбольш важных раёнах. Дакладчыкамі па ўсіх іншых раёнах лічыць сакратароў РК.

6. Прапанаваць усім ГК і РК КП(б)Б не пазьней 27 лютага арганізаваць пры РК камісіі па падрыхтоўцы да зьлётаў у складзе: заг. арганвідзелам ГК, РК (старшыня), заг. райза, сакратара ГК-РК ЛКСМБ і ўпаўнаважанага ЦК, на якіх ускладаецца поўная адказнасьць за падрыхтоўку і арганізацыю зьлётаў.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГІКАЛО.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

ПОУНАСЬЦЮ САБРАЦЬ НАСЕНЬНЕ!

Стаўка на самацёк

МАЗЫР (Ад нашага спецыяльнага карэспандэнта).

Ужо больш месяца ў зводцы мазырскага раёна аб ссыпцы насеньня збожжавых фігуруе адна лічба — 95,6 проц., а па страхавых фондах—другая лічба—99 проц.

Але праналічваем, што хапаецца за гэтымі лічбамі. Возьмем важную культуру для раёну—авёс. Наводле вестак раёна аўса ссыпана ў насенны фонд 84,5 проц. і ў страхавы—72,8 проц. Яшчэ горш з вікай, якой ссыпалі ўсяго 68,7 проц. За лік яго-ж культур амаль «выканан» план па збожжавых. Аказваецца,—за кошт менш каштоўных культур, як проса, грэчка і інш.

Да гэтага трэба дадаць, што лічбы раёна аб засыпцы насеньня яўна дутыя, у ізна ня верыць нават і сам загадчык раёна тав. Радыяновіч.

За няпрысылку рэгулярных зводак па ссыпцы насеньня Радыяновічу ня так даўно бюро ЦК КП(б)Б абвясьціла суровую вымову. І вось, замест таго, каб праверыць становішча з ссыпкай насеньня ў кожным калгасе, у кожным населённым пункце, раёнсамаддзел усту піў на шлях ашуканства партыі і пролетарскай грамадзянасьці, па шлях штампоўкі заведама дутых зводак.

Ці можна пасьля гэтага лічыць, што калгасы сэктар па Мазырыччыне забясьпечан насеньнем. Адпак, як гэта ня дзіўна, раёна і раённая пасеўная пяцёрка лічыць, што калгасы ў раёне насеньнем забясьпечаны. Яны зусім забылі пра пастанову бюро ЦК КП(б)Б, якая абавязвае ўсе РК і РВК забясьпечыць ссыпку насеньня і страхавых фондаў па культурах у строгай адпаведнасьці з планам сяўбы для кожнага калгасу.

Нават па зводцы раёна фонд ссыпнай пшаніцы ня толькі не пакрывае недахват аўса, але і не забясьпечвае засеў тэй плошчы, якая вызначана планам пад гэту культуру. Што датычыць жыта, дык яго ня ссыпана **НІ АДНАГО КІЛЕ.**

Ня выканаўшы плян па тэхнічных культурах. Так, канапель у насенфонд ссыпана 85,6 проц., а ў страхавы — 80 проц.

Ня лепшае, а значна горшае стаўленне ў аднаасобным сэктары. Удзельная вага аднаасобнікаў у агульным пляне пасеўнай плошчы складае 58,4 проц. Як відаць, лічба даволі значная.

Пастанова бюро ЦК КП(б)Б аб тым, каб на кожныя 10 гаспадарак аднаасобнікаў быў выбран упаўнаважаны, які-б разам з членам сельсавету адказваў за ўкараненьне насеньня, таксама не ажыцьцёўлена. Ні ў адным сельсавеце ўпаўнаважаныя дзесяцідворак ня выбраны. У сьвятле гэтага становіцца вусім зразумелым, чаму аднаасобнікі на 24 лютага ссыпалі ў страхавы фонд толькі 33 проц. патрэбнага насеньня. Ні па адной культуры заданьне поўнасьцю ня ссыпана.

Кулацкі сабатаж на гэтым адказнейшым участку падрыхтоўкі да сяўбы не сустракаю адпору. Чым, як не патураньнем кулаку можна тлумачыць тое становішча, што па 4-х сельсаветах (Капылскім, Калескім, Церабоўскім і Казіміраўскім) дагэтуль у страхавыя фонды ня ссыпана ні аднаго кілё насеньня.

Нельга прайсьці міма і наступнага факту. У апошнія тыдні ў калгасы ўступае шмат аднаасобнікаў. Многія з іх пад уплывам кулацкай агітацыі раз базарылі насеньне. Праўленьні-ж калгасаў і райсамаддзел не паставілі перад імі рубам пытаньне аб тым, што поваўступіўшыя калгаснікі павінны пры ўступленьні ў калгас абагуліць насеньне.

Райсамаддзел, які здарваны ад калгасаў, які ня ведае, што фактычна робіцца на месцах, сваёй бязьдзейнасьцю патурае клясаваму ворагу ў яго справах сарваць засыпку насеньня.

Ссыпаным можна лічыць толькі тое насеньне, якое ўжо ачышчана. Між тым, ні райзо, ні раённая пасеўная пяцёрка сур'ёзна гэтай справай не займаюцца. Даволі сказаць, што райзо ня ведае колькі і якога насеньня ачышчана. На пытаньне аб ачыстцы насеньня, загадчык райзо адказвае: «Некаторыя калгасы ачысьцілі, некаторыя прыступілі, а некаторыя яшчэ не пачыналі». Камэнтары да гэтага не патрэбны. Каляндарны плян ачысткі насеньня ня выпрацаван. Многія трыеры ў калгасах зусім не скарыстоўваюцца. Райзо, як і сельсаветы ня далі калгасам ніякіх указаньняў.

Нічога ня зроблена ў раёне і па абмену недобраякаснага насеньня на гатункове. Райзо абмежавалася толькі тым, што наведаміла калгасам аб абмене і на гэтым супакоілася, а калгасы, відаць, чакаюць, пакуль насенкантора прывязе ім насеньне ў сьвірны. Ні адзін калгас свайго насеньня яшчэ не абмяняў.

Паданыя факты з усёй яснасьцю паказваюць, што райком партыі, райвыканком і райсамаддзел не мабілізавалі раённыя арганізацыі і калгасныя масы на бальшавіцкую падрыхтоўку да веснавой сяўбы.

Ва ўсёй рабоце панує самы агідны самацёк.

Фралоў.

„Энтузіясты" з Гарза...

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.).

Яшчэ 20 студзеня загадчык Гомельскага гарэа Гобараў і дырэктар Гомельскай МТС выбраліся рапартаваць Наркамзему аб стопроцантным выкананьні плану ссыпкі насеньня. «Энтузіястаў» затрымаў Гомельскі гарком партыі, які прапанаваў не сьпяшацца, а раней праверыць. Ня гледзячы на гэта, «энтузіясты» з гарза і МТС 25 студзеня зноў выбраліся рапартаваць, абы збыць работу з рук. У справу ўмяшалася ГарКК-РСІ.

Хутка выявілася, што ў вестках гарза выпала даволі важная графа. Мы маем на ўвазе ачыстку насеньня, бо ссыпаным можна лічыць толькі тое насеньне, якое ўжо ачышчана. На жаль пра гэту дырэктыву ЦК КП(б)Б і СНК БССР у Гомельскім гарза забылі.

24 студзеня афіцыяльныя зводкі гарза паведамлялі аб тым, што насенны фонд па калгасах ссыпаны на 93,6 проц., а страхавы на 99,6 проц. А назаўтра пры праверцы выявілася, што ўвесь плян ссыпкі насенных і страхавых фондаў выкапан толькі на 37 процантаў. Гэта было бліжэй да сапраўднасьці.

Па радзе сельсаветаў становішча значна горшае. Напрыклад, калгасы **Жгуньскага, Даробінскага, Жгуна-Будзкага, Карналінскага, Яроменскага і Прудноўскага** сельсаветаў ссыпалі ад 48 да 80 проц. патрэбнага насеньня.

Калгасы **«1 жніўня», імя Сталіна, «Чырвоны герой»** яшчэ не пачыналі ссыпкі страхавых фондаў па ячменю. Калгас імя **Сталіна** ў насенны фонд замест 11,2 цэнтн. ссыпаў 8,2 цэнтн. ячменю, калгас **«Камунар»** замест 49 цэнтн. ссыпаў — 39 цэнтн., **«Чырвоны бацэ»** замест 11,2 цэнтн.—4,84. Гэтыя калгасы абслугоўваюцца Гомельскай МТС.

Такі вынік бястурботнасьці апаратаў в Гомельскага гарэа і МТС.

Н. Г.

„Кожны ўдарнік, кожны добрасумленны калгаснік абавязан перш за ўсё паклапаціцца аб тым, каб забясьпечыць свой калгас насеньнем". (З адозвы ўсесаюзнага зьезду калгаснікаў-ударнікаў).

Насеньне ссыпана

У Маскве толькі што закрыўся зьезд калгаснікаў-ударнікаў. Гэта зьезд пябачнай у сьвеце дэманстрацыі нашай сілы, дэманстрацыі адданасьці працоўнага сялянства камуністычнай партыі.

Зьезд вусім правільна абвясьціў веснавую насеўную кампанію **зкзаменам на годнасьць бальшавіцкага калгасу.**

Наш калгас імя **КАРЛА МАРКСА**, Міхалеўскага сельсавету, Бабруйскага раёну, які яднае 38 гаспадарак, яшчэ мае цэлы рад недахопаў. Ураджайнасьць нашых палёў ганебна нізкая. У мінулым годзе мы зьнялі з аднаго гэктару па 6-7 цэнтнераў збожжавых. Гэта сьведчыць аб тым, што мы ня здолелі выкарчаваць барбарскага вядзеньня сельскай гаспадаркі. Мы слаба змагаліся з гультаямі. У нас ёсьць такія, якія за цэлы год выпрацавалі ад 30 да 50 працадзён. Былі выпадкі драпежніцкіх адносін да каня, да калгаснага інвэнтару і маемасьці наогул.

Што намі зараз зроблена для таго, каб зьнішчыць гэтыя недахопы і каб заваяваць годнасьць бальшавіцкага калгасу?

Нам вызначан плян насеву ў 79,5 га. Мы высунулі сустрэчны ў 93,5 га за лік павялічэньня пасеваў збожжавых і тэхнічных культур. На ўсю прынятую намі плошчу пасеву ўжо поўнасьцю ссыпана насеньне ў памеры **526 цэнтн. і 82,6 цэнтн. у страхавы насенны фонд.** Усё насеньне ачышчана на трыеры. За захаваньне насеньня адказвае член праўленьня **Зайцаў Янка.** Увесь інвэнтар за выключэньнем 9 калёс з 23 поўнасьцю адрамантаваны. Рэшта калёс будзе закончана рамонтам у бліжэйшыя дні. Збруя поўнасьцю адрамантавана і падагнана да кожнага каня. За збрую адказвае старшы конюх **Бакач**, а за інвэнтар заг. гаспадаркай **Зайцаў Н.**

Прапрацаваўшы пастанову ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб падрыхтоўцы каня да сяўбы, мы правялі наступныя мерапрыемствы: вылучылі конюхамі выпрабаўзных калгаснікаў, адданых партыі і калгаснаму ладу — гэта **Бакач Нічыпар, Жоўцаў Андрэй і Данцэвіч Сцяпан.** Кожнаму конюху вызначана нагрузка ў 10 коняй. Усе коні пацэлены па дзьве групы — 17 працаздольных і 9 слабасільных. Для кожнай групы складзен спэцыяльны кармавы рацыён, які пры эканомным выдаткаваньні корму забясьпечыць ад паўдзеньне ўсяго конскага парку нашага калгасу. Кожны конь у сярэднім атрымлівае 12 клг. грубых кармоў (сена, амецьце) і 1 клг. вобменкі з субары. А калі конь ідзе на цяжкую работу яму дадаецца 2 клг. аўса ці іншых канцэнтратаў. Карміленьне і паеньне робіцца тры разы ў дзень. Уведзена шматзменная чыстка коняй і вызначан дзе іх выходны дзень. На час веснавой сяўбы па кожнага каня забранізана па 2 цэнтн. канцэнтратаў і па 15 клг. грубых кармоў у дзень.

Але ці ўсё намі зроблена, каб дабіцца ўздыму ўраджайнасьці нашых палёў? Не, далёка ня ўсё.

Каб быць поўнасьцю гатовымі да сяўбы, мы абавязваемся добраякасна захаваць насеньне і інвэнтар да пачатку палявых работ, пратрымаць усё насеньне. За тры дні да выхаду ў поле паставіць рабочых коняй на адпачынак і ўзмоцненую падкормку. Зараз-жа прыступіць да складаньня пастаянных вытворчых брыгад, замацаваўшы іх за вучасткамі на пэрыяд севазвароту. Усіх гультаёў, якія выпрацавалі менш 100 працадзён, мы выкінем з сваіх радоў. Зараз мы пачынаем вывазку гною на поле і зьбіраем 2 тоны попелу.

Мы ставім перад сабой задачу дабіц ца з кожнага гэктару збожжавых 8,2 цэнтн., бульбы — 125 цэнтн. і тэхнічных культур 3,5 цэнтн. Гэта вусім рэальнае заданьне. Партыя і ўрад са свайго боку зрабілі ўсё неабходнае для ўздыму ўраджайнасьці нашых палёў, **УСЁ АСТАТНЯЕ ЗАЛЕЖЫЦЬ АД НАС САМІХ.**

Так мы адказваем на заклік усесаюзнага зьезду калгаснікаў-ударнікаў, так мы ўключаемся ва ўсесаюзнае спаборніцтва па лепшую падрыхтоўку да вясны, за ўсесаюзны паход за высокі ўраджай.

Па даручэньні сходу:

Т. Бакач, Н. Зайцаў, К. Андрэй

За заслонай зводак

ДРЫСА. (Наш кар.).

«Няма насеньня, няма чаго ссыпаць» — так паўтараюць кулацкую хлусьню кіраўнікі **Каркалецкага, Юззфоўскага, Росіцкага сельсаветаў.** Ня толькі гавораць вуснамі кулака, але і ажыцьцяўляюць яго практыку. Ня дзіва, што гэтыя сельсаветы ссыпалі ад 15 да 34 проц. ільнанасеньня. Тут мы маем справу з адкрытым супраціўленьнем спэцыялізацыі Дрысенскага раёну ў ільнаводчым напрамку.

Калгас **«Камінтэрн»**, Валынецкага сельсавету, таксама разбазарыў насеньне. Сам старшыня «камуніст» **Арлоўскі** ўзяў сабе 20 пудоў пшаніцы, а 24 пуды пшаніцы выдаў рахункаводу.

У калгасе **«Пагранічная зорка»**, Лунячарскага сельсавету, старшыня праўленьня **Сьвіловы** і брыгадзір **Кабылінскі** (абодвы члены партыі) палову ільнанасеньня пусьцілі ў мякіну. Гэту «мякіну» разьмеркавалі памж калгаснікамі, а ссыпаць зараз «няма чаго».

У калгасе **«Барацьбіт»**, Росіцкага сельсавету, брыгадзір былы стражнік, **Іваноў** наўмысля скарміў два вазы ільнянога насеньня сьвіням. Гэта рабілася на вачох сакратара партыйнай ячэйкі **Маразоўскага**, які зараз усімі мерамі прабуе запраўдаць сваю палітычную блізарукасьць і прымірэнцтва да клясавых ворагаў.

Цястаўскі сельсавет на 10 лютага ссыпаў 73 проц. збожжавых, 42 проц. ільну і 85 проц. бульбы.

Што-ж робяць перараджэнцы з партбілетамі ў кішэнях — старшыня сельсавету **Шчорбінскі** і сакратар партячэйкі **Адзінокі**, каб утаіць сваю бязьдзейнасьць?

Яны паведамляюць у раён аб стопроцантнай ссыпцы насенных і страхавых фондаў і нагла ашукваюць партыю і пролетарскую грамадзянасьць. Аб гэтым злачынным ашуканстве ведалі ўпаўнаважаны РК і РВК **Косаў** і загадчык вытворчага вучастку МТС член РКК КП(б)Б **Гагарын.** Ведалі, але ніякіх мер не прынялі.

Насеньне ў раёне ёсьць, аб гэтым сьведчыць практыка перадавых калгасаў, дзе на чале знаходзяцца ім «шляпы», а сапраўдныя бальшавікі, якія забясьпечылі гатоўнасьць гэтых калгасаў да сяўбы. Да такіх калгасаў трэба адносіці калгас **«Чырвоны Выбаржац»**, які поўнасьцю ссыпаў насенны і страхавы фонды, ачысьціў усё насеньне і ссыпаў у фонд міжкалгаснай узаемадапамогі 8 цэнтн. вікі і 5 цэнтн. збожжавых. Ссыпаў насеньне калгас **імя Варашылава**, Валынецкага сельсавету, калгас **«Барацьбіт»**, Галубоўскага сельсавету, **«Новы шлях»** і шмат іншых.

А ў раёне ня толькі не пашыраюць вопыт перадавых калгасаў, а толькі займаюцца штампаваньнем дутых і ілжывых зводак, якія дасылаюць некаторыя сельсаветы. Зводы райзо мяняюцца, як падворо'е. За апошнія дні насенныя фонды па збожжавых, напрыклад, нейкім чынам зьменшыліся на 164 цэнтн., па ільну — на 55 проц. і па бульбе — на 207 цэнтн.

І выйшла! Калгас **«Чырвоны прамень»**, Росіцкага сельсавету, лазічыў летась у калгасе імя Дзяржынскага 33 цэнтн. ільну, якія ён пайнен быў сёлета вярнуць. Ільнанасеньне гэта яшчэ ня было абмалочана, а акт быў ужо складзен на яго, як на ссыпанае. А калгас імя Дзяржынскага таксама «ссыпаў» гэта ільнанасеньне. У калгасе «Чырвоны прамень» сядзеў упаўнаважаны па падрыхтоўцы да вясны з раёну **Гузман**, брыгадзір ЦК КП(б)Б **Аляшкевіч** (інстытут асьпірантуры БАН), а ў калгасе імя Дзяржынскага **Кавалоўскі**, работнік ЛЕСМЕ. І толькі ў апошнія дні, калі пачалася фактычная праверка ссыпанага ільнанасеньня, выявілася гэта грубая памылка.

У **Сар'янскім** сельсавеце ў нагоні за дутымі процантамі калектывізацыі арганізавалі калгас **«Новы будаўнік»**, які ня ссыпаў ні аднаго кілёграма насеньня, было толькі «абавязацельства» ссыпаць яго. Гэта насеньне таксама ўключылі ў зводку. А па справе — «Новы будаўнік» ілжэкалгас, у якім і ня думаюць стварацца насенфонды.

Тое-ж самае і ў Бігосаўскім сельсавеце. Арганізавалі два новыя калгасы, узялі распіску аб ссыпцы насенфондаў. А насеньне фактычна ня ссыпана.

Тры калгасы Каркалецкага сельсавету: імя 13 Кастрычніка, «Іскра» і «Чырвоны прамень» некалькі дзён таму назад паведамілі, што ўсё насеньне ссыпана і зважана. А праз два дні насеньне збожжавых культур ужо зьменшылася на 40 цэнтн.

Паданыя вышэй факты паказваюць, што Дрысенскі райсамаддзел зусім адарваны ад калгасаў і ад калгаснай вытворчасьці. Работнікі райсамаддзелу патрузьлі ў паперках і не бачаць як клясавыя ворагі разбазарваюць насенныя фонды і зрываюць падрыхтоўку да веснавой сяўбы.

Такое кіраўніцтва калгасамі ня можа забясьпечыць іх гатоўнасьць да выхаду ў поле.

Л.

У раёне не сьпяшаюцца...

ГАРАДОК. (Наш кар.).

На 20 лютага насеньне — галоўная матар'яльная база сяўбы — па калгасным сэктары яшчэ ня ссыпана: па збожжавых плян выкапан на 90 проц., па бульбе — на 76,6 проц., а па відучай культуры ільну — на 57,4 проц. Страхавыя фонды па ільнанасеньні ссыпаны па 50 проц., па бульбе на 50,9 проц.

У аднаасобным сэктары справа яшчэ горш. Аднаасобнікі ссыпалі ў страхавы фонд 37,4 проц. насеньня ільну і 38 проц. насеннай бульбы.

Асабліва тут праяўляецца **кулацкае супраціўленьне ссыпцы насеньня ільну.** За 20 дзён лютага прырост складае 7,5 проц., а трэба-ж яшчэ сабраць 50 проц. насеньня ільну. З 29 сельсаветаў поўнасьцю ссыпалі ільнанасеньне **толькі калгасы Вайханскага і Вярацкага сельсаветаў.**

Дзе-ж прычыны ганебнага адставаньня раёну?

Яны крыюцца выключна ў тым, што кулацкі сабатаж тут не зломлен. Яны крыюцца і **ў гнілым лібералізьме раённага кіраўніцтва, якое не заўважае маневраў клясавага ворага і не дае ім належнага адпору.**

Каб пацьвердзіць нашу думку спынімся на канкрэтных фактах. У Геркаўскім сельсавеце кулацкі агент **Багданаў** адкрыта выступае супроць ссыпкі насеньня. Сельсавет-жа з ім лібэральнічае.

У калгасе **«Усход»**, Пільканскага сельсавету, не хапае 12 цэнтн. ільну, 3 цэнтн. жыта. Калгас яшчэ не вярнуў насенную пазыку ў 5,5 цэнтн. жыта. Разам з тым старшыня калгасу **Сяргеенка**, рахункавод **Маркаў** і іншыя члены праўленьня разьмеркавалі паміж сабой, вярнай разбазарылі, 26 цэнтн. збожжа і 16 цэнтн. бульбы. Гэта апрача таго, што яны атрымалі на прадпрыемствах.

У калгасе **«Май»**, Хвашнянскага сельсавету, увесь ураджай разьмеркавалі па працадзёх, а на насеньне не па кінулі ні аднаго кілёграма. У камуне **імя Блюхэра** ёсьць лішкі насеньня — 43 цэнтн. ячменю, 6 цэнтн. гароху.

Сакратар Сялішчанскай парт'ячэйкі **Семяніцкі** ў другой палове студзеня хваліўся... «Мы правялі ссыпку насеньня за два дні, гэта справа лягчэй, чым ільназагатоўкі». У выніку самазаспакоенасьці Семяніцкага калгасы сельсавету ссыпалі толькі 66 проц. насеньня ільну, а аднаасобнікі — 63 проц.

Сакратар партыйнай ячэйкі **Пальмінскага** сельсавету **Шамардзін**, бі-жа загадчык вытворчага вучастку МТС, вусім ня цікавіўся ссыпкай насеньня. У яго на вачох у калгасе **«Чырвоны перакоп»** лён малацілі так, што большая частка яго засталася ў мякіне і пайшла на корм жывёле. Круючыя па сады ў гэтым калгасе занялі кулакі—кладаўшчык **нулак Англічанаў**, жывёлавод — **цьвёрдазаданьнік Цьвяткоў**, брыгадзір — **цьвёрдазаданьнік Дзямідзенка**, член праўленьня — **цьвёрдазаданьнік Таўпачоў.** Яны наўмысля заблыталі ўлік, каб лягчэй было красьці і расьцягваць калгаснае дабро. А расьцягвалі ўсё што толькі маглі: і бульбу, і гарох, і жыта. Толькі такія «шляпы», як Шамардзін гэтаго не заўважыў.

Посьбіты кулацкіх антыільнаводчых тэндэнцый чэшнны атрымаць па заслугах.

Вярхоўскі.

Штампоўшчыкі...

ВІЦЕБСК. (Наш кар.).

20 лютага ў «Зьвязьдзе» мы ўжо адзначалі, што зводкі аб ссыпцы насеньня, якія **Віцебскі** гарсавет дасылае ў Наркамзем, не **адпавядаюць сапраўднасьці.**

Сёньня мы зноў прымушаны падкрэсьліць, што блытаніна і ашуканства ў справе ссыпкі насеньня па Віцебскаму раёну пераходзіць ужо ў сыстэму.

У зводцы на 10 лютага гарсавет паказвае, што калгасамі ссыпана ў насенны і страхавы фонды 20.853 цэнтн. збожжавых культур і 707 цэнт. ільнанасеньня. Праз пяць дзён, г. зн. 15 лютага ў зводцы ўжо паказваецца, што збожжавых ссыпана 20.647 цэнт. і ільнанасеньня 676. За пяць дзён колькасьць збожжавых культур зьменшылася на 206 цэнтн. і ільнанасеньня на 31 цэнтн.

Як магло гэта здарыцца?

Для таго, каб адказаць на гэта пытаньне, даволі прасачыць за практыкай работы раду сельсаветаў. **Замастоцкі** сельсавет, напрыклад, на 10 лютага паведаміў, што калгасы ссыпалі 298 цэнтн. насеньня аўса, а 15 лютага — 888 цэнтн. **Рудніцкі** сельсавет 10 лютага рапартаваў аб ссыпцы 914 цэнтн. аўса, а 15 лютага ўжо зьменшыў лічбу да 831 цэнтн.

Такія выпадкі не адзінкавыя. У зводках **Рудакоўскага** сельсавету на 15 лютага ўказана, што калгасы ссыпалі 470 цэнтн. ячменю, гэта ў той час, калі 10 лютага сельсавет паведамляў, што калгасы ссыпалі 634 цэнтн.

Тое-ж самае і з бульбай. Паводле даных гарсавету калгасы **Рудніцкага** сельсавету на 10 лютага ссыпалі 5.805 цэнтн. насеннай бульбы, а праз пяць дзён гэта лічба зьменшылася на 391 цэнтн. Такі-ж малюнак і са ссыпкай ільну. Сельсаветы займаюцца простым ашуканствам партыі, а штампоўшчыкі з гарсавету ім дапамагаюць.

Вось чаму мы абсалютна ня можам верыць Віцебскаму гарсавету, які ён на 15 лютага паведамляе Наркамзему аб тым, што на калгасах раёну на 15 лютага ссыпана збожжавых — 20.647 цэнтн. (плян 26.516 цэнтн.), ільнанасеньня — 676 цэнтн. (плян 1.074 цэнт.) і бульбы на 109,3 проц.

Што датычыць ссыпкі страхавых фондаў і захаваньня насеньня аднаасобным сэктарам — дык аб гэтым гарсавет абсалютна нічога ня ведае. Тое, што ў Віцебскім раёне ёсьць каля 3.500 аднаасобных гаспадарак, роля якіх у пасеўнай кампаніі даволі значная, гарза зусім ня ўлічвае.

Нічога невядома гарсавету і аб ходзе ачысткі насеньня — адной з асноўных умоў у барацьбе за ўзьнаўленьне ўраджайнасьці. Трэба падкрэсьліць, што і тут не абыходзіцца без «очковтирательства». Так Рудакоўскі сельсавет шле рэляцыі аб поўнай ачысткі насеньня. Пры праверцы-ж выяўляецца, што ачышчана толькі 20 процантаў насеньня. Рад сельсаветаў, як **Бараўлянскі, Віцебскі і Сляпецкі** да ачысткі насеньня толькі зараз прыступілі.

Зусім натуральна пустае пытаньне ці здольны Віцебскі гарсавет яны дапамозе свайго сельгассэктару забясьпечыць сапраўдную бальшавіцкую падрыхтоўку да веснавой сяўбы?

Мы чакаем ад Віцебскага гаркому партыі адпаведных выводаў, адносна «кіраўніцтва» Віцебскім гарсаветам ходам падрыхтоўкі да вясны.

А. Зарубежны.
Д. Пацярэнка.

А. Рай

ФІКСАТАРЫ ПРАРЫВАЎ

Клічаўская раённая партарганізацыя не перабудавала сваёй работы па кіраўніцтве сельскай гаспадаркі ў адпаведнасьці з новай абстаноўкай і задачамі ў вёсцы. «Узросшая адказнасьць і складанасьць задач, якія стаяць перад партыяй у цэлым і кожнай пізавой партыйнай ячэйкай у даны пэрыяд, патрабуюць неадкладнай, карэннай перабудовы і рашучага ўмацаваньня партыйнай, арганізацыйна-масавай і палітвыхаваўчай работы партыі ў адпаведнасьці з указаньнямі тав. Сталіна па-новаму працаваць, па-новаму кіраваць». Гэта дырэктыва пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б не знайшла належнага адбітку ў рабоце раённага партыкіраўніцтва. Райком партыі абмежаваўся фармальнай прапрацоўкай па становы ліпеньскага пленуму аб перабудове партработы і амаль нічога канкрэтнага ня ўжыў для не ажыцьцяўленьня.

Толькі і зроблена ў галіне перабудовы пізавой партсеткі, што... ліквідаваны тры партыйныя ячэйкі, якія штучна былі створаны пры сельсаветах і складаліся выключна з прымацаваных раённых работнікаў. Расстаноўка партыйных сіл у Клічаўскім раёне праводзілася без належнага ўліку вытворчага і палітычнага становішча таго ці іншага калгасу ці саўгасу, без уліку здольнасьці таго ці іншага камуніста выразна ажыцьцяўляць дырэктывы партыі на даручаным вучастку работы. Што гэта так, аб гэтым красамоўна гавораць факты. Да апошняга часу на чале некаторых калгасаў, саўгасаў, сельсаветаў і нават парт'ыйных ячэек сталі людзі, якія страцілі клясавы твар, якія зрасьліся з аўтацкімі элементамі, аказаліся буржуазнымі перараджэнцамі з партыйнымі білетамі ў кішэні. Толькі за апошні пэрыяд найбольш напружанай работы на фронце загатовак раённае парткіраўніцтва прымушана было выключыць з партыі пяць сакратароў парт'ячэек і аддаць іх пад суд. Чатыры сакратары за грубае скажэньне лініі партыі прыцягнуты былі ў гэты пэрыяд да партыйнай адказнасьці.

Ня гледзячы на тое, што склад сакратароў парт'ячэек у значнай колькасьці малады па партыйнаму стажу, райком партыі не займаўся спэцыяльнай падрыхтоўкай кадраў пізавых партзьвеньняў. Назіраецца надзвычай вялікая цякучасьць сакратарскага складу. З часу апошніх перавыбараў з 18 сакратароў парт'ячэек засталіся толькі 4, а 14 заменены.

Да вылучэньня апорных парт'ячэек на вёсцы РК КП(б)Б падышоў фармальна. Апорнымі былі вылучаны парт'ячэйка саўгасу **Бацзвічы** і міжкалгасная **Грыбавецкая** парт'ячэйка. Першая складаецца з 9 членаў КП(б)Б, **але ні адзін з іх не працуе непасрэдна на вытворчасьці.** У Грыбавецкай ячэйцы налічваецца 6 членаў і 4 кандыдаты партыі. З іх тры прымацаваны з раённага актыву, тры старшыні калгасаў і толькі **два калгаснікі.** Зразумела, што такія ячэйкі ня могуць апраўдаць свайго прызначэньня, ня могуць быць вядучымі ў адносінах да прымацаваных да іх парт'ячэек. Гэтыя ячэйкі ня маюць узорнага паказу работы і ні ў якай меры ня могуць зьяўляцца паказальнымі па-свайму вопыту работы для іншых ячэек. Вылучэньне гэтых дзьвёх ячэек апорнымі зроблена толькі для вылучэньня.

З боку райкому няма дыферэнцыяванага кіраўніцтва парт'ячэйкамі. Адзіны партдзень толькі нядаўна ўведзен у сыстэму. Вынікі партдня не падагульваюцца ні ў ячэйках, ні ў райкоме. Вельмі важная новая форма масавай работы — палітгдні — ні ў адным калгасе не праводзіцца. Агітколектывы і агітатары толькі вылучаны. Іх работа яшчэ не разгорнута. Вельмі слаба пастаўлена кіраўніцтва рабселькораўскім рухам і нізавым друкам. У большасьці парт'ячэек недаацэньваецца справа марксэцка-ленінскага выхаваньня камуністаў.

Такое становішча вельмі дрэнна адбілася на ходзе выкананьня чарговых гаспадарча-палітычных задач у вёсцы. Партыйная арганізацыя раёну не ў вы старчальнай меры мабілізавала калгасныя, бядняцкія і серадняцкія-аднаасобныя масы на барацьбу супроць кулацкіх элементаў, на барацьбу з усякімі спробамі клясавага ворага шкодзіць калгаснаму будаўніцтву і на правядзеньне чарговых гаспадарча-палітычных кампаній у вёсцы. Больш таго, **раённае парткіраўніцтва ня здолела ўзьняць на належную вышыню клясавую пільнасьць камуністаў для барацьбы супроць кулацкай агентуры ў сваіх радох, супроць буржуазных перараджэнцаў, якія адлюстроўвалі ў сваёй дзейнасьці кулацкую ідэалёгію.** У выніку гэтага сыстэматычна правальвалася выкананьне важнейшых задач.

Клічаўскі раён зьяўляецца бульбяна жывёлагадоўчым. Раённая партарганізацыя не змагалася па-бальшавіцку за спэцыялізацыю раёну. Плян веснавой сяўбы па радзе асноўных культур недавыканан. Вось некаторыя паказальнікі, якія характарызуюць прыпаапартуністычную практыку Клічаўскай партарганізацыі ў часе веснавой сяўбы. Выкананьне пляну па саўгасах і калгасах характарызуецца наступнымі паказальнікамі:

	Саўгасы	Калгасы
Па бульбе	52 проц.	50 проц.
Па аўсе	80,5 проц.	85,3 проц.
Па ячмені	87,3 проц.	72,6 проц

Як у калгасах, так і саўгасах амаль не праводзіўся аграмінімум. Адсюль вельмі нізкая ўраджайнасьць. Напрыклад, у саўгасах **Бацзвічы, Насята, Астравы** ўраджай на бульбе складаў 45-50 проц., па аўсе — 2-3 цэнтн. З прычыны дрэннай ураджайнасьці па калгасах і саўгасах раёну пакінута на ўбранымі 645 гэкт. жыта, 617 гэкт. аўса, 52 гэкт. пшаніцы, 35 гэкт. ячменю і г. д.

Плян асеньняй сяўбы выканан саўгасамі толькі на 61 проц. і калгасамі на 80,6 проц.

Калі дадаць да ўсяго сказанага тое, што Клічаўскі раён зьяўляўся найбольш адсталым у выкананьні асноўных відаў загатовак, дык зусім відавочна, што **клічаўскае раённае парткіраўніцтва аказалася надольным забясьпечыць выразнае правядзеньне дырэктыў партыі.**

Клічаўская партарганізацыя ня ўлічыла новых мэтадаў, замаскаваных мэтадаў клясавага ворага ў яго супраціўленьні разгорнутаму сацыялістычнаму наступленьню. Гэтым імкнна і тлумачыцца тое становішча, што калгасы раёну аказаліся вельмі ў вялікай меры засьмечанымі кулацкімі элементамі. У калгасах **«Камінтэрн», «Бальшавік», «Бацзвічы», «Зьвязда», «Пераможца», «Беларусь»** і інш. былыя цьвёрдазаданьнікі і ідэйныя кулакі звай шлі сабе прытулак нават на адказнай рабоце. Кулацкія элементы Гулько, Маркаў, Цімахевіч, Шамятун, Харлап і інш. працуюць рахункаводамі, нарыхтоўнікамі і кладаўшчыкамі. Калгас **«Зара»**, Ядрына-Слабодзкага сельсавету, складаецца з 7 гаспадарак, з якіх тры цьвёрдазаданьнікі і два кулакі, пазбаўленыя выбарчых правоў. У калгасе **«Шлях сацыялізму»** (Усохскі сельсавет) кулакі Касьцян (старшыня калгасу), Шалід (пазвод) і Касьцян (рахункавод, сын ліквідатара) усялякі тэрарызавалі беднату і напракалі не, што яна ўвайшла ў калгас.

— Нас прымусілі ўвайсьці ў калгас цьвёрдае заданьне, — адкрыта заяўлялі кулакі, — але чаго вас лячыстая сіла загнала сюды, — упікалі яны беднату.

Гэта кулацкая зграя дабілася выхаду з калгасу беднякоў. Выжываньня з калгасу беднякоў дамагліся кулакі і ў калгасах «Міхайлава», «Зьвязда», пры актыўнай дапамозе інструктара райкалгасу **Прорвіча** — сына мясцовага кулака. Вельмі засьмечаны розным антысавецкімі элементамі і саўгасы. Па саўгасах раёну палічваецца і зараз 13 кулакоў, 9 былых паліцэйскіх і жандараў.

Усім гэтым клясава-варожым элементам удалася на працягу доўгага часу беспакарана шкодзіць у калгасах і саўгасах таму, што іх дзейнасьці патуралі апартуністы і буржуазныя перараджэнцы.

Апартуніст **Шадура**, будучы на чале **Віркаўскага** сельсавету, «працаваў» у цесным хаўрусе з кулакамі. Шадура, выкананючы сацыяльны заказ клясавага ворага, утойваў кулакоў-злачынцаў, якія спаялілі калгаснае гумно, а пад суд аддаў двух беднякоў-аднаасобнікаў. Аб гэтым ведаў і сакратар партыйнай ячэйкі **Умец**, але і ён таксама аказаўся на поводзе ў кулака. Старшыня **Даўмянскага** сельсавету **Якімавец**, старшыня **Рыбавецкага** сельсавету **Мароз**, старшыня **Ваяўніцкага** сельсавету **Дрозд**, а таксама сакратары партыйных ячэек **Пладнікоўскі, Лісневіч, Цыпт** і інш. аказаліся буржуазнымі перараджэнцамі, яны патралі кулаку, пакрывалі кулацка-заможныя гаспадаркі ад выкананьня загатовак. Старшыня **Кабылянскага** сельсавету **Берагейка** мала таго, што даваў паблажку кулацкай частцы вёсцы ў выкананьні загатовак, але нават даручаў папу заданьні на правядзеньні палітычных кампаній. Ён выканаў яму кантрольнае заданьне — распаўсюдзіць праз царкву аблігацый пазыкі «4-ты заключны» на 500 рублёў.

«Камуністы» Ачыновіч і Счысьлёнак адкрыта ўзначальвалі кулацкі сабатаж у выкананьні загатовак. Яны заяўлялі: «У салян браць няма чаго, таму плян усё роўна выканаць немагчыма». А потым проста дэзартавалі з сельсавету, куды іх пасылалі для ўдзелу ў правядзеньні загатовак.

На чале загатоўчага апарату ў Клічаўскім раёне знаходзіліся махровыя апартуністы. Напрыклад, **Якімавец**, які, будучы загадчыкам канторы райзагатжывёла, прымаў на работу ў свой апарат былых гандляроў і пакрывал розных пенадзейных элементаў. Пры ўдзеле Якімаўца праводзіўся абмен загатоўленай жывёлы са спэкулянтамі. Пастановай СНК БССР ад 20 сьнежня Якімавец зьнят з работы, але ў раёне фактычна яго адхілілі ад работы толькі ў першых лічбах студзеня. Загадчык райзагатільну **Літвінаў** літаральна бязьдзейнічаў на даручаным вучастку

КЛІМАВІЦКАЙ МТМ КУЛАКІ І ШКОДНІКІ ЗРЫВАЮЦЬ РАМОНТ ТРАКТАРАЎ

Герої апартуністычнай практыкі

Рамонт трактараў і прычапнога інвентару ў Шклоўскай МТС знаходзіцца пад пагрозай зрыву. З 29 трактараў, патрабуючых капітальнага рамонту, да гэтага часу адрамантавана толькі 4 трактары.

Дырэктар МТС Зелянкоўскі займаецца на яўным «очковтирательством», кажучы, што адрамантавана быццам 13 трактараў.

Якасьць рамонту прымушае біць трывогу. У 10 трактарох маркуецца ўстанавіць старыя негодныя запчасткі. У выніку трактары ня будуць працаваць.

Для рамонту трактараў былі прыцягнуты 8 трактарыстаў і некалькі спэцыялістаў МТС, але трактарысты з прычыны дрэнных матар'яльна-бытавых умоў, разьбегліся.

Трактарысты, па словах дырэктара МТС Зелянкоўскага, быццам згодна дагавору з гарспажыткам прымацаваны да сталоўкі лесазаводу «Барацьба». Фактычна-ж ніякай дагаворанасьці няма і абедаў трактарысты не атрымліваюць. Прычым, дырэктар лесазаводу Гемскі даў распараджэньне загадчыку сталоўкі: «мазаным (гэта значыць трактарыстам) абеды не адпускаць», а дырэктар МТС Зелянкоўскі, сакратар парт'ячэйкі **Філіпаў**, старшыня рабкому **Бульбоў** на гэта не рэагуюць, пальцам аб палец не стукнулі для таго, каб зьнішчыўшы гэтыя ненармальнасьці, стварыць патрэбныя ўмовы для работы трактарыстаў.

З належачых да рамонту ў майстэрні МТС 40 плугоў адрамантаваны толькі 33. Але гэтыя адрамантаваныя плугі раскіданы па двары і знаходзяцца ў безгаспадарчым становішчы. Яны ляжаць пад адкрытым небам і іржавеюць у той час, калі рядам з майстэрняй ёсьць добрая навець.

На запытаньне, чаму ня прымаюцца меры да захаваньня ў належным стане плугоў, Зелянкоўскі адказвае: **«Гэта не мая справа, я ў майстэрні, наогул кажучы, рэдка заходжу, бо ёсьць больш важныя справы».**

Падрыхтоўка кадраў для МТС — па сутнасьці адна з адказнейшых задач. Між тым кіраўніцтва па гэту работу не зьвяртае ніякай увагі.

МТС павінна была ў гэтым годзе правесьці курсы па падрыхтоўцы 40 новых трактарыстаў. Гэта работа была зроблена без адпаведнай падрыхтоўкі, у выніку — на курсы ў парадку самацёку зьявілася замест 40 чалавек толькі 20, з якіх 5 чалавек фактычна 1 зьявілася колькасьць дзяцей фізычна нездольных працаваць на трактары.

Усе гэтыя факты яркі кажуць аб поўнай непадрыхтаванасьці Шклоўскай МТС да веснавой сяўбы, аб злачынна-нядбайных адносінах трыкутніка МТС да пытаньня своечасовай падрыхтоўкі да сяўбы і рамонту трактарнага парку, патрабуюць рашучай перабудовы ўсёй работы МТС.

Міх.

ВЕСТКІ

аб вырабе запасных частак і рамонце трактараў на заводах Белмэтапятрэсту па цэнтралізаваных і дадатковых заданьнях на 24 лютага 1933 году

НАЗВА ДЭТАЛЯЙ	Агульнае заданьне	Выкананьне	Проц.
Адліўка балванак для калец ХТЗ і ФП	28000	18263	65,2
Поршняў камплектных	500	226	45,0
Абточка поршневых кольцаў	18200	5943	32,6
Шатунных балтоў	11200	300	2,6
Дыскі муфт сцапленьня	100	30	30,0
Утулкі бронзавыя для галовак шатуна	1400	500	36,0
Утулкі ПАПФ	550	80	14,3
Утулкі шатуна	400	91	23,0
Адліўка поршняў	700	973	139,0
Апрацоўка поршняў	1400	692	49,0
Поршневыя пальцы	1250	304	24,0
Адліўка каробак	200	137	68,0
Апрацоўка каробак	200	103	51,0
Адліўка гільз	400	240	60,0
Апрацоўка гільз	400	18	4,0
Адліўка буксе	55	30	52,0
Утулак для галоўкі шатуна	150	—	—
Утулак роліка пальцаў для трактара «Манах»	160	—	—
Рамонт трактараў	312	53	17,0

***

Выраб запасных частак для рамонту трактараў зьяўляецца адной з галоўных задач у справе падрыхтоўкі да веснавой сяўбы. Ня даць своечасова запасных частак — г. зн. сарваць рамонт трактараў і с.-г. машын, г. зн. сарваць пасьпяховае правядзеньне веснавой сяўбы.

Гэтай, зусім зразумелай ісьціны, аднак, не ўявілі сабе цэлы рад партыйных і прафсаюзных заводзкіх арганізацый і кіраўніцтва заводаў і ня прынялі адпаведных мер для таго, каб забясьпечыць своечасовы выпуск запчастак. Больш таго, асобныя заводзкія партарганізацыі, як, напрыклад, завод **Варашылава** (Менск), замест сапраўднай мабілізацыі рабочых мас на выкананьне важнейшага заданьня ўраду і партыі па выпуску запчастак займаюцца парадзнасьцю ды абяцанкамі, а выпуск запчастак і рамонт трактараў па-сутнасьці правальваюць.

Пастановай ЦК КП(б)Б устаноўлен «максымальны тэрмін вырабу запасных частак у частцы, якая вызначана заданьнем ЦК КП(б)Б 5-га сакавіка». Да гэтага тэрміну завод імя Варашылава абавязан даць 500 камплектных поршняў і адрамантаваць 25 трактараў. Заданьне па выпрацоўцы поршняў на 24 лютага заводам выканана ўсяго на 45 проц., а з 25 прымацаваных трактараў не адрамантавана ні аднаго.

Такое-ж прыкладна становішча ў частцы рамонту трактараў мы маем па заводах **«Кімунар»**, дзе з 25 прымацаваных трактараў не адрамантавана ні аднаго, **«Рухавік рэвалюцыі»**, дзе з 60 трактараў адрамантавана толькі 5.

Заданьне па абточцы поршневых кольцаў заводам «Рухавік рэвалюцыі» выканана на 27 проц., а па апрацоўцы поршняў — на 44 проц. Ня лепш справа з запчасткамі і на заводзе «Пралетары», Гомсельмаш і «Чырвоны адраджэнец» і інш.

Заводзкія арганізацыі не зварачаюць належнай увагі на якасьць прадукцыі, у выніку маюць месца выпадкі выпуску негодных запчастак, як гэта мела месца на заводзе **«Чырвоны адраджэнец»** (Магілеў), які выпусьціў дрэнная якасьці поршневыя кольцы, а таксама на **Гомсельмашы**, дзе выявіўся вялікі процант браку па лёцьці поршняў.

Партыйныя і прафсаюзныя, гарадзкія, раённыя і заводзкія арганізацыі павінны нарадзіць сыстэматычны кантроль за ходам вырабу запасных частак. Шляхам разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, шляхам арганізацыі на заводах МТМ, МТС, сыгнальных пастоў і надзвычайных кантрольных камісій, неабходна ўцягнуць у практычную барацьбу за пасьпяховае выкананьне заданьня шырокія масы рабочых. На кожным заводзе, на кожнай МТМ і МТС справу неабходна паставіць так, каб самі рабочыя кожны дзень сачылі за ходам выкананьня заданьня на вырабу запасных частак і рамонту трактараў. Гэтага патрабуюць інтарэсы пасьпяховага правядзеньня веснавой сяўбы.

ГРАФІКІ І СПРАВЫ

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

Гомельская машына-трактарная майстэрня налічвае зараз 52 рабочых і мае ўсе магчымасьці выпускаць з рамонту ня менш 4-х трактараў у дзень. Іменна ўлічваючы гэтыя магчымасьці, майстэрні дана заданьне адрамантаваць да веснавой сяўбы **Гомельскай МТС** 16 трактараў, **Церахаўскай МТС** — 32 трактары, **Рэчыцкай**—30 трактараў, **Хойніцкай**—26 і 15 трактараў для асобных калгасаў, а ўсяго такім чынам 119 трактараў.

Паводле зацьверджанага графіку МТМ да рамонту павінна была прыступіць не пазьней 15 студзеня і 20 сакавіка скончыць рамонт і здаць апошнія 29 трактараў. Графік адтак, на жаль застаўся толькі на паперы. Да 10 лютага гэта зн., **больш як за месяц майстэрня не адрамантавала ні аднаго трактара.** Больш таго, яна нават ня ўлічыла, і да гэтага часу ня ведае, які патрэбен рамонт таму ці іншаму трактару.

Гэтым самым майстэрня паставіла пад пагрозу зрыву рамонт усяго прымацаванага да яе трактарнага парку і падрыхтоўку да веснавой сяўбы. Апрача таго яна зрывае выкананьне, зьвязаных з рамонтам трактараў, заказаў для заводаў **«Гомсельмаш»** і **«Рухавік рэвалюцыі»**.

Усё гэта тлумачыцца тым, што ў МТМ адсутнічае правільная арганізацыя работы і расстаноўка сіл. Абязьлічка ў рабоце і засьмечанасьць асабовага складу пусьцілі глыбокія карэньні ў майстэрні. Яны прыводзяць да прагулаў, з якімі кіраўніцтва не вядзе ніякай барацьбы.

Характэрна, 8 лютага ня выйшаў на працу адзіны ў майстэрні токар. Варштат пры наяўнасьці вялікай колькасьці работы прастаяў цэлы дзень. Зрабіў прагул у гэты дзень нават сам табельшчык — член ЛКСМБ **Манарэнка.**

Загадчык майстэрні т. **Балевіч**, замест рашучай барацьбы з прагульшчыкамі займаецца разважаньнямі накшталт «ну вы-ж самі бачыце, як-жа можна зволіць чалавека, без якога майстэрня ня можа абыйтіся».

Характэрнае вось такой апартуністычнай установкі загадчыка, [illegible] брыгадзір Мацкевіч займаўся [illegible] — наўмысьля зламаў ролікавы падшыпнік і замест рамонту трактараў у МТМ, дзе ён лічыўся брыгадзірам, рабіў прагулы і **займаўся рамонтам прыпусаў у сваёй уласнай саматужнай майстэрні.**

Усё гэта магло здарыцца толькі таму, што грамадзкасьць майстэрні бязьдзейнічала. Фабкому, напрыклад і парт'ячэйкі ня толькі ня было фактычна, а нават ня лічылася і на паперы. На жаль іх няма яшчэ і зараз. Гарпрафсавет хаця аб гэтым і ведаў, але ніякіх мер да ажыўленьня работы майстэрні ня прымаў. Яму, бачыце, запятаму больш важнымі справамі, як відаць не да твару займацца такімі «дробязямі» як майстэрня па рамонту трактараў.

Значную частку віны за агіднае становішча работы майстэрні трэба адносьці і на Трактарацэнтр. Ён добра ведаў, што майстэрня слаба абсталявана, але замест дасылкі ёй некаторага вельмі патрэбнага абсталяваньня пасылае апошняе ў МТС, дзе яно ляжыць без усялякага скарыстаньня, а майстэрня ня можа прыступіць да работы. Напрыклад, **Гомельская МТМ** ня мае прыбору для расточкі карэнных падшыпнікаў, а **Трактарацэнтр** гэты прыбор засылае **ў Цэрахаўскую МТС**, дзе ён на працягу доўгага часу ляжыць без усялякага скарыстаньня. Засланы туды таксама і прыборы для шліфоўкі цыліндраў, якіх няма ў майстэрні.

Праўда, Трактарацэнтр, з некаторым абсталяваньнем МТМ ня крыўдзіць. Ён замест патрэбных для майстэрні 3-х сьвідравальных варштатаў прыслаў 7, а першага лютага дасылае за подпісам дырэктара Трактарацэнтру тав. **Грэбенчыка** адносіну, у якой піша: «З атрыманьнем гэтага тэрмінова адпрузіце з наяўных у вас 7 сьвідравальных варштатаў адзін новы для **Буда-Кашалёўскай МТС**».

Заслана таксама больш як патрэбна і тачыльных варштатаў. Але разам з гэтым **даслан варштат для расточкі цыліндраў без ражучай галоўкі, рэзцоў і мікрамэтра для ўсталоўкі** рэзцоў, без чаго, зразумела, варштат не варштат, а непатрэбная рэч, якая загружае майстэрню.

Зразумела усё гэта разам з бязьдзейнасьцю кіраўніцтва майстэрні прывяло да зрыву пляну рамонту трактараў і нават да зрыву падрыхтоўкі да гэтага рамонту. Майстэрня да рамонту ня можа прыступіць як след і зараз паколькі своечасова не падрыхтавала адпаведных запасных частак.

Для таго, каб як належыць разгарнуць работу па рамонту трактараў і с.-г. машын і выкарыстаць усе тыя магчымасьці, якія ў гэтым напрамку мае майстэрня, ёй неабходны запасныя часткі.

Жалеза, лямешная сталь, бабіт, волава, поршні, поршневыя абручыкі (кольцы), шатунныя балты, пальцы галоўкі шатуна, бронзавыя ўтулкі, клапаны, перадатачныя валікі, укладышы шатуна і інш. — вось запчасткі і матар'ялы, у якіх **Гомельская МТМ** адчувае вялікую патрэбу. Гэта патрэба майстэрні **саюзснабрамонтам** павінна быць задаволена ў самы кароткі тэрмін.

Над майстэрняй шэфствуе завод імя **Ланцуцкага**, які мае ўсе магчымасьці дапамагчы майстэрні наладзіць работу. Але да самага апошняга часу гэтай дапамогі майстэрня ня бачыла і шэфства па сутнасьці лічылася толькі на паперы. У апошні час завод выручыў намесьніка загадчыка дырэктара і значную частку кваліфікаваных рабочых, пры дапамозе якіх майстэрня пачала разгортваць работу.

Ня менш 4-х трактараў у дзень— вось баявая праграма рабочых МТМ. На выкананьне гэтай праграмы павінны быць мабілізаваны ўсе сілы і сродкі майстэрні. Праграма гэта рэальна і яна павінна быць выканана.

Кіраўніцтва МТС, трактары, якіх прымацаваны для рамонту да Гомельскай МТМ, павінны тэрмінова даставіць гэтыя трактары, ці частці трактараў, патрабуючыя рамонту разам з дэфэктнымі ведамасьцямі ў майстэрню. Адсутнасьць саміх трактараў зрывае работу майстэрні наогул і рамонт трактараў у прыватнасьці, а адсутнасьць дэфэктных ведамасьцяй не дае магчымасьці майстэрні своечасова запатрабаваць адпаведныя запасныя часткі і матар'ялы. Гэта павінны ўлічыць дырэктары ўсіх МТС, прымацаваных да гомельскай майстэрні.

М. Рабцэвіч.

Пленум аргкамітэту Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў БССР

24-га лютага ў польскім дзяржаўным тэатры адбылося ўрачыстае адкрыцьцё першага пашырэнага пленуму арганізацыйнага камітэту Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў БССР. Пленум адкрыўся ўрачыстай прамовай старшыні Аргкамітэту тав. Клімковіча. У прэзыдыум выбраны т. т. Жабраўскі, Ляўкоў, Кірпоцін, Платуш, Брагінскі, Ляхаў, Тарыч, Некрашэвіч, Клімковіч, Янка Купала, Якуб Колас, Александровіч, Лынькоў, Харык, Галавач, Кузьма Чорны, Крапіва, Чарот, Кобец, Бэндэ, Дварчанін, Дунец, Самахвалаў, Кацнэльсон, Эрмлер, Броўка, Гараўскі Шаўцоў (завод імя Варашылава), Звонак, Домбаль і інш.

Пад бурныя апляўдысмэнты выбіраецца ганаровы прэзыдыум у складзе: **палітбюро ЦК УсеКП(б) на чале з тав. Сталіным, бюро ЦК КП(б)Б на чале з тав. Гікало, т. т. Тэльман, Ленскі, Корчык, Постышаў, Стэцкі, Гронскі, Максім Горкі, Серафімовіч.**

На абвесткі дня работ пленуму стаяць наступныя пытаньні: **«Сучаснае становішча беларускай савецкай літаратуры і задачы ССПБ»** (даклад тав. Клімковіча); **творчыя пытаньні** — даклады т. т. **Бранштэйна і Ліманоўскага; даклад кіно-фабрыкі «Савецкая Беларусь»**—даклад дырэктара фабрыкі тав. **Кацнэльсона.**

ПРАМОВА тав. КІРПОЦІНА

На першым урачыстым пасяджэньні з вялікай прывітальнай прамовай ад **Усесаюзнага аргкамітэту Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў** выступіў, спатканы працяжнымі воплескамі, адказны сакратар яго тав. **Кірпоцін.**

Сваё выступленьне тав. **Кірпоцін** пачынае словамі:

— Прывітаньне савецкім пісьменьнікам Беларусі! Прывітаньне брацкім пісьменьнікам, якія сабраліся ў гэтай залі, якія з гонарам выконваюць задачы сацыялістычнага будаўніцтва сілаю мастацкага слова! Прывітаньне ад пісьменьнікаў Масквы, ад пісьменьнікаў РСФСР, ад пісьменьнікаў усяго Савецкага саюзу!

Пастанова ЦК УсеКП(б) ад 23 красавіка мінулага году па перабудову работы літаратурных арганізацый, — адзначае тав. **Кірпоцін**, — была выклікана паваротам у бок савецкай улады, у бок пралетарыяту большасьці лепшых кадраў савецкай інтэлігенцыі, большасьці лепшых, найбольш таленавітых, найбольш адданых пісьменьнікаў Савецкага саюзу.

На аснове выкананьня пастаноў Цэнтральнага Камітэту ад 23 красавіка мы дабіліся вялізарнейшых посьпехаў у справе перамаганьня групаўшчыны, замкнутасьці, адарванасьці паасобных атрадаў і груп пісьменьнікаў паміж сабой. На аснове пастановы **ЦК**, на аснове выкананьня лініі партыі мы дабіліся зараз найлепшых сапраўдных умоў для наладжаньня правільных узаемаадносін паміж пісьменьнікамі-камуністамі і іншымі атрадамі савецкіх пісьменьнікаў.

Тав. **Кірпоцін** прыводзіць словы тав. **СТАЛІНА** з яго апошняй прамовы на зьезьдзе калгаснікаў-ударнікаў аб тым, што **«сіла бальшавікоў, сіла камуністаў заключаецца ў тым, што яны ўмеюць акружаць нашу партыю мільёнамі беспартыйнага актыву»** і падкрэсьлівае, што наладжаньне нармальных адносін паміж пісьменьнікамі-камуністамі і пісьменьнікамі беспартыйнымі мае месца ў аспродзішчы беларускай пісьменьніцкай грамадзкасьці. Яркім доказам гэтага, — кажа тав. **Кірпоцін**, — зьяўляюць выступленьні на пленуме ўсесаюзнага аргкамітэту ў Маскве народнага паэта **Янкі Купалы.** Ён выступіў з указаньнем таго, што прыносіць свой творчы талент, сваё ўменьне, сваё майстэрства паэта на службу сацыялізму. І той прыём, які быў яму аказан, тыя авацыі, якія раздаліся па адрасу слаўных беларускіх пісьменьнікаў, былі доказам тае мовы ўзаемнага разуменьня, якім аблягчаецца выкананьне пастановы ЦК.

Тав. **Кірпоцін** робіць аналіз вылазкам клясавага ворага на літаратурным фронце на прыкладах рускай літаратуры, і ў прыватнасьці па вылазках Сідарэнкі, Ніказовіча і Баранавых у беларускай літаратуры. Але я ўпэўнен, — кажа тав. **Кірпоцін**, — што мы на базе таго вялізарнага згуртаваньня, таго вялізарнага яднаньня, якое стварылася паміж пісьменьнікамі-камуністамі і савецкімі пісьменьнікамі-беспартыйнымі, на базе вялізарнага пазаруту ўсяго лепшага, што ёсьць у мастацкай літаратуры ў Беларусі, РСФСР, ва ўсім Саюзе, мы здолеем перамагчы і да канца дабіць рэшткі варожых выступленьняў, для таго, каб стварыць сацыялістычную літаратуру.

Беларусь, якая раней усяляк ганьбавалася пануючымі клясамі, разглядалася імі, як аб'ект эксплёатацыі і ўціску з боку памешчыкаў і капіталістаў, у савецкіх умовах, ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту выявіла вялізарны творчы рост у галіне эканомікі, культуры, у прыватнасьці мастацкай літаратуры. Лепшыя творы беларускіх пісьменьнікаў становяцца творамі, якія ведаюць усе народы Савецкага саюзу. У гэтым годзе ў Маскве падрыхтоўваецца перавод лепшых твораў беларускіх пісьменьнікаў. Бясумоўна, гэта яшчэ далёка ня ўсё, што трэба зрабіць і мы павінны **яшчэ больш узмацняць і шырыць гэту нашу брацкую сувязь.**

Ніколі яшчэ раней літаратура і мастацтва, — указвае далей тав. **Кірпоцін, — ня мелі такіх умоў для свайго росту, як ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту, як ва ўмовах Савецкага саюзу.** Ні адна кляса не магла аддаваць столькі ўвагі, столькі клопатаў колькі аказвае рабочая кляса і камуністычная партыя **сваёму мастацтву,** сваёй літаратуры. Вы ведаеце, што пытаньнямі мастацкай літаратуры займаецца і ЦК камуністычнай партыі на чале з тав. **Сталіным**, займаецца ЦК КП(б)Б, што мастацкай літаратурай займаецца пралетарыят 1 працоўны ўсяго Савецкага саюзу.

Савецкая мастацкая літаратура — гэта вялізарная сіла, якая выхоўвае і загартоўвае масы будаўнічоў сацыялізму, якая дапамагае чалавеку скінуць з сябе рэшткі ўласьніцкай псыхалёгіі, дапамагае яму змагацца за сацыялізм.

Пасьля тав. Кірпоціна з прывітаньнем пленуму выступіў рэжысэр кінафабрыкі «Савецкая Беларусь» тав. **Тарыч.**

Тав. **Дварчанін**, які жадаўна быў абмінен з фашысцкай Польшчай, перадаў пленуму прывітаньне ад рэвалюцыйных пісьменьнікаў Заходняй Беларусі і ў цікавай прамове расказаў аб тым дзікім сацыяльным і нацыянальным уціску, якім чыняць польскія фашысты ў Заходняй Беларусі.

ДАКЛАД тав. КЛІМКОВІЧА

На гэтым-жа пасяджэньні пленум Аргкамітэту прыступіў да дзелавой работы. Старшыня аргкамітэту тав. **Клімковіч** выступіў з вялікім дакладам аб сучасным становішчы беларускай савецкай літаратуры і яе далейшых задачах.

У сваім дакладзе тав. **Клімковіч** указвае, што рост беларускай літаратуры зьяўляецца простым вынікам на шага агульнага гаспадарчага і культурнага росту, агульных перамог сацыялізму, заваяваных у працэсе жорсткай клясавай барацьбы.

На аснове магутнага гаспадарчага росту Совецкай Беларусі заваяваны вялікія перамогі ў галіне нацыянальна-культурнага будаўніцтва. Радам фактаў і лічбаў дакладчык паказвае вялікі размах культурнага росту раней няпісьменнай, забітай, паўкалёніяльнай царскай акраіны Беларусі. Напрыклад, у галіне выдавецтва за чатыры гады да першай пяцігодкі было выдана **791** назва, а за першую пяцігодку колькасьць назваў узрасла ўжо да 4.035. Кошт кніжнай прадукцыі першай пяцігодкі—13 млн. руб.

Шырока пастаўлена палітасьветная работа. Зараз налічваецца ў рэспубліцы звыш 1600 кіноўстановак. На ўсіх мовах выдаюцца часопісы і газэты. За апошнія гады арганізаваны 64 раённыя газэты, 30 часопісаў, звыш 100 шматыражак. Ушчэнт разьбіта контр-рэвалюцыйная тэорыя Троцкага аб тым, што перыяд дыктатуры пралетарыяту ня можа быць перыядам будаўніцтва пралетарскай культуры. Ушчэнт разьбіта тэорыя правых апартуністаў аб немагчымасьці для рабочых і сялян аўладаць тэхнікай і культурай у такіх разьмерах, якіх мы дасягнулі за першую пяцігодку.

Тав. **Клімковіч** падрабязна спыняецца на абвастрэньні клясавай барацьбы на культурным фронце, што зьяўляецца простым вынікам клясавай барацьбы ў краіне, кулацкага сабатажу ў часе загатовак. Клясавы вораг імкнуўся і будзе імкнуцца пралезьці ў літаратуру, каб адсюль праводзіць сваю контр-рэвалюцыйную справу. Тав. Клімковіч зрабіў падрабязны разгляд контр-рэвалюцыйных, нацдэмаўскіх вылазак на разных этапах сацыялістычнага будаўніцтва, падрабязна спыніўся на апошніх нацдэмаўскіх вылазках **Сідарэнкі-Пенчачэнка, Ніказовіча, Баранавых** і інш.

На аснове ажыцьцяўленьня пастановы ЦК УсеКП(б) ад 23 красавіка і адпаведных пастаноў ЦК КП(б)Б пра перабудову літаратурных арганізацый, дабіліся значных перамог, значных посьпехаў. Тав. Клімковіч у кароткіх рысах спыняецца на росьце пісьменьніка **Кузьмы Чорнага** («Бацькаўшчына»), **Крапівы** (яго раман «Мядзьведзічы»), даў аналіз новым творам беларускіх пралетарскіх пісьменьнікаў з моладзі.

Далей дакладчык спыняецца на росьце савецкіх, нацыянальных літаратур — ўкраінскай, польскай і інш.

З палітычных памылак, якія мелі месца ў рабоце аргкамітэту, тав. Клімковіч адзначае **недастатковасьць барацьбы з групаўшчынай, недастатковую кансалідацыю партыйна-камсамольскай вядучай часткі арганізацыі, зусім слаба пастаўленае палітычнае выхаваньне, не наладжана творчая вучоба пісьменьнікаў, абсалютна слабая работа з ударнікамі, заклікаными ў літаратуру.**

З нашых недахопаў,—кажа тав. Клімковіч—выцякаюць шэпы задачы. Нам трэба ў самы бліжэйшы час перабудаваць сваю работу такім, чынам, каб наша пісьменьніцкая арганізацыя сапраўды і па-бальшавіцку магла дапамагчы нашай партыі ў яе вялізарнай рабоце па будаўніцтву сацыялізму. А асноўнай праграмай дзейнасьці нашага саюзу творчай работы кожнага пісьменьніка, павінны стоць даклад і прамова тав. **Сталіна** на пленуме ЦК і ЦКК, на зьезьдзе калгаснікаў-ударнікаў, рад іншых партыйных дакумантаў.

Ва ўсёй нашай рабоце,—канчае свой даклад т. **Клімковіч**,—трэба быць нам яшчэ больш пільнымі да клясавага ворага, працаваць сапраўды па-бальшавіцку; нажіраваць усе сілы савецкай літаратуры, пад кіраўніцтвам партыі, на пасьпяховае выкананьне пастаўленых задач другой пяцігодкі.

***

25 лютага пасяджэньне пленуму адбылося ў Доме Пісьменьнікаў. На прыватным пасяджэньні былі заслуханы даклады т. **Бранштэйна і Ліманоўскага.** Вечарам разгарнуліся спрэчкі па заслуханых дакладах.

„Скончыць поўнае выкананьне пляну ільназагатовак да 27 лютага 1933 г.

з тым, каб да 1 сакавіка былі падведзены вынікі аб поўным выкананьні пляну. Пленум ЦК і ЦКК папярэджвае РК і РВК, што гэты тэрмін зьяўляецца канчатковым* (З пастановы лютаўскага аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б)

АПОШНЯЕ ПАПЯРЭДЖАНЬЕ

«Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б патрабуе ад усіх партыйных і савецкіх арганізацый БССР на аснове мабілізацыі калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас і рашучай барацьбы з кулацтвам і яго агентамі ў партыі і савецкім апараце—скончыць поўнае выкананьне пляну ільназагатовак да 27 лютага 1933 году в тым, каб да 1 сакавіка былі падведзены вынікі аб поўным выкананьні пляну».

Гэта дырэктыва лютаўскага пленуму ЦК КП(б)Б абавязвае ўсе арганізацыі, пашу грамадзкасьць, шамагчы ўсе сілы, каб завяршыць ільназагатоўкі, абавязвае разгарнуць сапраўды ўдарную работу.

Ці забясьпечваюць цяперашнія тэмпы загатовак выкананьне дырэктыў партыі? Ні ў якім разе. Возьмем даныя па асноўных ільнаводчых раёнах БССР. На 24 лютага выканана 86,4 проц. пляну. Прырост за дзень 0,1 проц. Толькі адзін Крупскі раён даў за 23 лютага 1,1 проц. пляну, усе іншыя выканалі ад 0,1 да 0,2 проц. заданьня. Такім чынам загатоўчая работа фактычна спынілася, ня гледзячы на тое, што большасьць ільнаводчых раёнаў яшчэ не ліквідавала сваёй запазычанасьці перад дзяржавай.

Дэмабілізацыйныя настроі, аслабленьне барацьбы з супраціўленьнем клясава-варожых элемэнтаў, гнілыя лібэральныя адносіны да перараджэнцаў у радзе раёнаў прывялі да такога становішча.

Каб завяршыць загатоўкі да вызначанага тэрміну трэба штодня загатаўляць 3.5 проц. пляну, г. зн. трэба **ўдзесяцярыць тэмпы работы.** Ці можуць аказвае рабочая кляса і камуністычная партыя сваёму мастацтву, сваёй літаратуры. Вы ведаеце, што пытаньнямі мастацкай літаратуры займаецца і ЦК камуністычнай партыі на чале з тав. **Сталіным**, займаецца ЦК КП(б)Б, што мастацкай літаратурай займаецца пралетарыят 1 працоўны ўсяго Савецкага саюзу.

Савецкая мастацкая літаратура — гэта вялізарная сіла, якая выхоўвае і загартоўвае масы будаўнічоў сацыялізму, якая дапамагае чалавеку скінуць з сябе рэшткі ўласьніцкай псыхалёгіі, дапамагае яму змагацца за сацыялізм.

Пасьля тав. Кірпоціна з прывітаньнем пленуму выступіў рэжысэр кінафабрыкі «Савецкая Беларусь» тав. **Тарыч.**

Тав. **Дварчанін**, які жадаўна быў абмінен з фашысцкай Польшчай, перадаў пленуму прывітаньне ад рэвалюцыйных пісьменьнікаў Заходняй Беларусі і ў цікавай прамове расказаў аб тым дзікім сацыяльным і нацыянальным уціску, якім чыняць польскія фашысты ў Заходняй Беларусі.

ДАКЛАД тав. КЛІМКОВІЧА

На гэтым-жа пасяджэньні пленум Аргкамітэту прыступіў да дзелавой работы. Старшыня аргкамітэту тав. **Клімковіч** выступіў з вялікім дакладам аб сучасным становішчы беларускай савецкай літаратуры і яе далейшых задачах.

У сваім дакладзе тав. **Клімковіч** указвае, што рост беларускай літаратуры зьяўляецца простым вынікам на шага агульнага гаспадарчага і культурнага росту, агульных перамог сацыялізму, заваяваных у працэсе жорсткай клясавай барацьбы.

На аснове магутнага гаспадарчага росту Совецкай Беларусі заваяваны вялікія перамогі ў галіне нацыянальна-культурнага будаўніцтва. Радам фактаў і лічбаў дакладчык паказвае вялікі размах культурнага росту раней няпісьменнай, забітай, паўкалёніяльнай царскай акраіны Беларусі. Напрыклад, у галіне выдавецтва за чатыры гады да першай пяцігодкі было выдана **791** назва, а за першую пяцігодку колькасьць назваў узрасла ўжо да 4.035. Кошт кніжнай прадукцыі першай пяцігодкі—13 млн. руб.

Шырока пастаўлена палітасьветная работа. Зараз налічваецца ў рэспубліцы звыш 1600 кіноўстановак. На ўсіх мовах выдаюцца часопісы і газэты. За апошнія гады арганізаваны 64 раённыя газэты, 30 часопісаў, звыш 100 шматыражак. Ушчэнт разьбіта контр-рэвалюцыйная тэорыя Троцкага аб тым, што перыяд дыктатуры пралетарыяту ня можа быць перыядам будаўніцтва пралетарскай культуры. Ушчэнт разьбіта тэорыя правых апартуністаў аб немагчымасьці для рабочых і сялян аўладаць тэхнікай і культурай у такіх разьмерах, якіх мы дасягнулі за першую пяцігодку.

Тав. **Клімковіч** падрабязна спыняецца на абвастрэньні клясавай барацьбы на культурным фронце, што зьяўляецца простым вынікам клясавай барацьбы ў краіне, кулацкага сабатажу ў часе загатовак. Клясавы вораг імкнуўся і будзе імкнуцца пралезьці ў літаратуру, каб адсюль праводзіць сваю контр-рэвалюцыйную справу. Тав. Клімковіч зрабіў падрабязны разгляд контр-рэвалюцыйных, нацдэмаўскіх вылазак на разных этапах сацыялістычнага будаўніцтва, падрабязна спыніўся на апошніх нацдэмаўскіх вылазках **Сідарэнкі-Пенчачэнка, Ніказовіча, Баранавых** і інш.

На аснове ажыцьцяўленьня пастановы ЦК УсеКП(б) ад 23 красавіка і адпаведных пастаноў ЦК КП(б)Б пра перабудову літаратурных арганізацый, дабіліся значных перамог, значных посьпехаў. Тав. Клімковіч у кароткіх рысах спыняецца на росьце пісьменьніка **Кузьмы Чорнага** («Бацькаўшчына»), **Крапівы** (яго раман «Мядзьведзічы»), даў аналіз новым творам беларускіх пралетарскіх пісьменьнікаў з моладзі.

Далей дакладчык спыняецца на росьце савецкіх, нацыянальных літаратур — ўкраінскай, польскай і інш.

З палітычных памылак, якія мелі месца ў рабоце аргкамітэту, тав. Клімковіч адзначае **недастатковасьць барацьбы з групаўшчынай, недастатковую кансалідацыю партыйна-камсамольскай вядучай часткі арганізацыі, зусім слаба пастаўленае палітычнае выхаваньне, не наладжана творчая вучоба пісьменьнікаў, абсалютна слабая работа з ударнікамі, заклікаными ў літаратуру.**

З нашых недахопаў,—кажа тав. Клімковіч—выцякаюць шэпы задачы. Нам трэба ў самы бліжэйшы час перабудаваць сваю работу такім, чынам, каб наша пісьменьніцкая арганізацыя сапраўды і па-бальшавіцку магла дапамагчы нашай партыі ў яе вялізарнай рабоце па будаўніцтву сацыялізму. А асноўнай праграмай дзейнасьці нашага саюзу творчай работы кожнага пісьменьніка, павінны стоць даклад і прамова тав. **Сталіна** на пленуме ЦК і ЦКК, на зьезьдзе калгаснікаў-ударнікаў, рад іншых партыйных дакумантаў.

Ва ўсёй нашай рабоце,—канчае свой даклад т. **Клімковіч**,—трэба быць нам яшчэ больш пільнымі да клясавага ворага, працаваць сапраўды па-бальшавіцку; нажіраваць усе сілы савецкай літаратуры, пад кіраўніцтвам партыі, на пасьпяховае выкананьне пастаўленых задач другой пяцігодкі.

***

25 лютага пасяджэньне пленуму адбылося ў Доме Пісьменьнікаў. На прыватным пасяджэньні былі заслуханы даклады т. **Бранштэйна і Ліманоўскага.** Вечарам разгарнуліся спрэчкі па заслуханых дакладах.

Спэкулююць ільном на вачох сельсавету

ВУШАЧЫ. Раён выканаў годавы плян па ільнаваллаку на 82,8 проц. Ня гледзячы на скончэньне ўсіх тэрмінаў, процант выкананьня пляну ўзьнімаецца вельмі павольна. Паасобныя сельсаветы, дзе кіруючую ролю адыгрываюць кулацкія стаўленікі, зрываюць загатоўкі.

Весьніцкі сельсавет выканаў свой плян толькі на 57 проц. Старшыня сельсавету **Жаўроцак**, сакратар партячэйкі **Нікіпарад** і ўпаўнаважаны РК **Пятніца** крычаць, што ільну няма. Яны пусьцілі ўсю справу на самацёк, што прывяло да ганебнага провалу.

Такі-ж малюнак мы назіраем па Мала-Далецкім сельсавеце, дзе плян выканан на 56 проц. За апошнія дні на пункты не паступіла ні аднаго кілёграму. У гэтым сельсавеце заможнікі прадаюць і спэкулююць ільном, а парт'ячэйка і ўпаўнаважаны не бачаць гэтага.

На раёне з 10 па 20 лютага праведзен штурмавы дэкаднік. Але раённыя арганізацыі не забясьпечылі канкрэтнага кіраўніцтва штурмам і вынікі яго вельмі незначныя.

Брока.

Чорная дошка

Пастановай ЦК КП(б)Б і СНК БССР занесены на чорную дошку наступныя раёны:

ЗА ЗРЫЎ ЗАГАТОВАК ІЛЬНУ:

СЕНЬНЕНСКІ (

АДКРЫЎСЯ VII ПЛЕНУМ ЦК ЛКСМБ

Учора а 7 гадз. увечары адкрыўся VII пленум ЦК ЛКСМБ. На парадку дня:

1. Вынікі лютаўскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б.
2. Аб удзеле камсамолу ў падрыхтоўцы і правядзеньні веснавой сяўбы.
3. Даклады мазырскага і гомельскага райкомаў камсамолу аб масавай палітычнай рабоце.

Пленум пачаў свае работы ў прысутнасьці ўсяго складу сакратарыяту ЦК КП(б)Б.

Па першым пытаньні аб выніках лютаўскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б з вялікай прамовай выступіў сакратар ЦК КП(б)Б тав. ЖАБРОЎСКІ.

ТЭРОР СУПРОЦЬ КПГ УЗМАЦНЯЕЦЦА

Забарона камуністычных газэт і часопісяй

БЭРЛІН, 23. Паводле вестак камфракцыі рэйхстагу, паліцыя апячатала дом ЦК германскай кампартыі, у якім знаходзяцца таксама друкарня і рэдакцыя «Ротэ Фане», рэдакцыі камуністычнай прэсы «Кредзінст», Бэрлінскі камітэт кампартыі, цэнтральны і бэрлінскі камітэт камсамолу.

***

Зноў забаронены рад камгазэт і часопісяй, канфіскавана рад камуністычных выданьняў. На паўгода забаронена часопіс «Унзэрэ Цайт». Орган Міжрабпому «Трыбунал» забаронен да 17 красавіка. Газэта германскага камсамолу «Юнгэ Гарцэ», забаронена да 2 мая. Газэта «Дэр Ротэ Вэлер» забаронена да 21 красавіка. Апошні нумар часопісі «Арбэйтар Ілюстрэйтэд Цэйтунг» канфіскаван. Паліцыя паведамляе, што ў Дзюсэльдорфе канфіскавана паўмільёна экземпляраў камуністычных лістовак. Таксама быў цам выкрыт паліцыяй тайны склад камуністычнай літаратуры, дзе канфіскавана 30.000 лістовак.

Прадвыбарчыя масавыя сходы кампартыі

БЭРЛІН, 23. У Бэрліне кампартыя правяла рад прадвыбарчых масавых сходаў. Па сходзе ў «Спорт Палясьце» прысутнічала каля 20.000 чалавек. Зьявілася таксама шмат сацыял-дэмакратычных і рэйхсбанаўскіх рабочых, а таксама дэлегацыі фабрык, заводаў, беспрацоўныя, якія належаць да саюзу барацьбы з фашызмам, і шмат рабочай моладзі. З дакладам выступіў член ЦК германскай кампартыі Вільгельм Пік.

Пік падрабязна вылажыў праграмныя патрабаваньні кампартыі, накіраваныя на поўнае сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне працоўных мас Германіі. Пік выкрыў сапраўдны характар сацыял-дэмакратычнай прапановы, атрыманай кампартыяй аб заключэньні «пакту аб узаемным непадпадзе». Пры агульным падтрыманьні 20.000 прысутных Пік заявіў, што кампартыя гатова да любога адзінага фронту, у аснове якога ляжаць задачы рэвалюцыйнай барацьбы за інтарэсы рабочае клясы.

Як толькі Пік перайшоў да прытыкі распаражэньня аб школах, прысутны ў залі паліцэйскі афіцэр абвясьціў сход закрытым. У адказ на гэта 20.000 удзельнікаў сходу падняліся і засьпявалі «Інтэрнацыянал».

Прадвыбарчыя сходы кампартыі ў раёнах Бэрліну, Вэдынгу і Фрыдэнаў былі разагнаны паліцыяй. У Лейпцыгу на арганізаваным кампартыяй сходзе прысутнічала каля 20.000 чалавек. У Галі ў найбольшай залі гораду адбыўся масавы сход, скліканы кампартыяй. З прычыны перапаўненьня памяшканьня, там былі [illegible]ізаваны яшчэ два паралельныя сходы.

У ЧЭСКАЙ КАЗАРМЕ

Чэская буржуазія ўзмацнела стараецца чэхізаваць славакаў, немцаў, закарпацкіх украінцаў, вэнграў і інш. нацыянальнасьці, якія жывуць на тэрыторыі сучаснай Чэха-Славакіі. У радзе іншых выпрабаваных сродкаў чэхізацыі армія зьяўляецца адным з мацнейшых.

Гэту патрыётычную работу выконваюць 10 тыс. афіцэраў, 10 тыс. «ротмістраў», 119 генэралаў і 360 палкоўнікаў. Па афіцэрскаму корпусу маладзеж буржуазная Чэха-Славакія далёка апярэдзіла былую Аўстра-Вэнгерскую манархію. Колькасьць каманднага складу яшчэ больш павялічваецца ў сувязі з вацьверджаным у новым бюджэтным годзе павялічэньнем на 5.000 чал. дадатгэрміновікаў. Увесь гэты вялізарны апарат чэха-славацкая буржуазія ўтрымлівае за кошт шырокіх працоўных мас і паваршэньня становішча радавых салдат.

Гота відаць перш за ўсё з таго, як жывецца чэха-славацкаму салдату. Хапця гуртовыя цэны на прадметы харчаваньня зьнізіліся, харч салдат ня толькі не палепшыўся, а наадварот—значна пагоршыўся.

Зразумела «эканомяць» у першую чаргу на салдацкім пайку. Салдат жывіць учораўчадзь. Чэрві ў чэрствым хлебе, чарэвіце мяса, тухлы сыр, гнілыя макароны — такое звычайнае мэню чэха-славацкага салдата.

У некаторых пагранічных часьцях, як у 100 артылерыйскім палку ў Брацілаве, у інструктарскай роце салдаты зьвярнуліся да кампартыі чэха-славацкага парляманту з просьбай абараніць іх ад зьдзекаў начальства. У 101 артылерыйскім палку, калі салдаты падалі скаргу з прычыны гнілых прадуктаў, дык афіцэры заявілі їм: «Не падабаецца казённы харч — купляйце на свае грошы». Ва многіх вазных часьцях зусім адкрыта палянуюць афіцэрскую кухню за кошт салдацкага пайка.

Муштра і зьдзекі з боку каманднага складу прымаюць самыя ненармальныя формы. У 10 кавалерыйскім палку ў Бератове кожнага «навічка» прымушаюць частаваць начальства, чысьціць боты каманд'іру, купляць з жабрацкай салдацкай пенсіі мазь для абутку камандзіраў і інш. Група салдат, даведзеных да роспачы такімі зьдзекамі, уцякла са зброяю ў Вэнгрыю. У тым-жа палку ня было ні аднаго выпадку, калі-б салдаты атрымалі сваю «пэнсію» на рукі поўнасьцю.

Афіцэры 109 артылерыйскага палка Радгаўс і Брабец звычайна гавораць з салдатамі ў такім стылі: «Я выстаўлю табе ўсе твае 32 зубы, подыр! Я табе раскрышу ўсе косьці, брыда!».

Падобныя факты з жыцьця чэха-славацкай армії не адзінкавыя. Яны зьяўляюцца арганічнаю часткай тэй сыстэмы, якая існуе ў капіталістычнай Чэха. Славакіі.

Р.

Аб канфэрэнцыі Вялікага Дняпра

Як паведамляе аргкамітэт канфэрэнцыі «Вялікага Дняпра», адкрыцьцё канфэрэнцыі адбудзецца ў Кіеве 4 сакавіка ў 6 гадзін вечара.

Новыя запасы нафты

АШХАБАТ, 25. Урадавая камісія, што знаходзіцца зараз у Нафтадагу, на аснове геалёгічных даных устанавіла, што запасы нафты ў адной толькі паўночнай частцы Нафтадагу акрэсьліваюцца ў 4 млн. тон. Камісія ставіць пытаньне аб прыраўнаньні нафтаданскіх промыслаў да прадпрыемстваў усесаюзнага значэньня.

Японскія войскі прасоўваюцца ў глыбіню Жэхэ

ТОКІЕ, 24. Паводле паведамленьня агенцтва «Сімбун Рэнга», дзьве брыгады японскіх войск пад камандваньнем Сакамота пачалі 23 лютага наступленьне на тэрыторыю Жэхэ і мелі сутычкі з кітайскімі сіламі ў раёне Кайлу. Брыгады прасунуліся 25 кілёмэтраў на паўночны захад ад Кайлу і ва дуць наступленьне ў глыбіню Жэхэ. Газэта «Асахі» сьцьвярджае, што кітайскія войскі адступаюць у раёнах Кайлу, Люпін, Циньшань (на захад ад Кайлу).

***

ШАНХАЙ, 24. Старшыня ўраду правінцыі Жэхэ Тан Юі-лін выдаў загад, у якім паведамляецца аб японскім наступленьні на Жэхэ і бамбардыроўцы Нан-Пяньліна. У загадзе Тан Юі-лін абвяшчае аб сваёй рашучасьці аказаць супраціўленьне японскім войскам.

Як гаворыць нанкінская «Цэнтраль Ньюс Эджэнсі», на граніцы Жэхэ скан цэнтраваны наступныя японскія войскі: па лініі Цзін-Чжоу-Чаоян: дзьве дывізіі артылерыі і 4 авіязскадрыльлі; па лініі Сюічжун Юі-Нюан—дзьве дывізіі і дзьве авіябрыгады. Усяго каля 35.000 чалавек.

Супярэчнасьці паміж імпэрыялістамі абвастраюцца

Японія супроць пастаноў Лігі нацый

ЖЭНЭВА, 24. Адбылося пасяджэньне надзвычайнага пленуму Лігі нацый, прысьвечанае абгаварэньню праекту дакладу па японска-кітайскім канфлікце, складзенага на падставе 4 пункту 15 арт. статуту Лігі нацый. Гіманс ад імя камісіі запрапанаваў праект дакладу, які быў аднагалосна прынят. Таму члены «камісіі 19-ці» парашылі ня браць слова ў спрэчках па дакладу.

Потым выступіў кітайскі дэлегат Ієн. Аналізуючы пасобныя разьдзелы дакладу, Ієн асабліва падкрэсьлівае тэзісы аб тым, што Манчжурыя зьяўляецца неадлучнай часткай Кітаю і што японская дзеньні ня былі самаабаронай. Кітайскі дэлегат задаволен таксама «пядвухсансоўным вынікам у адносінах да так званай Манчжурскай дзяржавы, які пацьвярджае пункт гледжаньня кітайскага ўраду ў гэтым пытаньні». Ієн называе дакладаб'ёна ваўчым прыгаворам супроць «японскіх лідэраў, якія нанесьлі столькі шкоды Кітаю». Пераходзячы да прапаноў дакладу, Ієн выказвае задаволенасьць, што згодна дакладу першым прадметам пераговараў павінна быць арганізацыя эвакуацыі японскіх войск з акрэсьленнем яе этапаў і тэрмінаў. Ієн задаволен таксама «цьвёрдай пазыцыяй Лігі ў адносінах непрызнаньня Манчжоў-Го».

«Кітайскі ўрад,—заяўляе Ієн, шчыра вітае ідэю супрацоўніцтва ПАЗШ і СССР з Лігай нацый у яе намаганьнях урэгуляваць канфлікт». У заключэньне Ієн, ад імя кітайскага ўраду робіць «урачыстую заяву», што кітайскі ўрад будзе галасаваць за даклад.

Пасьля Ієна з доўгай прамовай выступіў японскі дэлегат Мацуока. Паводле слоў Мацуока, асноўнай прычынай «смуты» на Далёкім Усходзе зьяўляюцца «непаладкі» ў Кітаі, парушэньне ім міжнародных абавязацельстваў. Мацуока нагадвае, што пяць год назад ангельцы і амэрыканцы таксама пусьцілі ў ход зброю ў Нанкіне для «выратаваньня сваіх грамадзян».

Мяжуючы з Кітаем, які «знаходзіцца ў хаосе», Японія, па словах Мацуока, прабавала весьці прыміраючую палітыку дружбы і супрацоўніцтва, але гэтай палітыцы перашкаджаў Кітай. Адзначыўшы значэньне Манчжурыі для Японіі, Мацуока заклікаў у імя міру і парадку на Далёкім Усходзе ня прымаць дакладу. Пасьля прамоў прад стаўнікоў Вэнэцуэлы, Капады і Літвы, найменным галасаваньнем за даклад выказаліся 42 краіны, у тым ліку і Кітай. Дэлегат Сіяму ўстрымаўся. Японія галасавала супроць.

Потым Гіманс коратка далажыў юрыдычныя вынікі прынятай пастановы, пасьля чаго Мацуока прачытаў наступную заяву: «Японскі ўрад вымушан прыйсьці да вынікаў што погляды Японіі і іншых членаў Лігі на мэтады дасягнення міру на Далёкім Усходзе не супадаюць. Японскі ўрад вымушан прыйсьці да сьцьвярджэньня, што яго спробы супрацоўнічаць з Лігай нацый у адносінах японска-кітайскіх разгалоўсяў дасягнулі апошняй мяжы. Японскі ўрад, аднак, будзе ўжываць усе намаганьні для ўстаноўленьня міру і прыяцельскіх сардэчных адносін з іншымі дзяржавамі. Па вінен дадаць, што японскі ўрад, імкнучыся спрыяць добрабыту чалавецтва, будзе з усёй шчырасьцю супрацоўнічаць далей у справе усеагульнага міру».

Зрабіўшы сваю заяву, Мацуока пакінуў залю разам з астатнімі членамі японскай дэлегацыі. У палітычных колах адзначаюць, што ў прамове Мацуока ня было намёкаў на выхад Японіі з Лігі нацый.

Галадоўка служачых камунальных прадпрыемстваў Горадні

ВАРШАВА, 22. (ТАСС). Галадоўка гарадзкіх служачых у Горадні, пачатая 20 лютага ў выглядзе пратэсту супроць сыстэматычнага затрымліваньня зарплаты, прыняла шырокія разьмеры. Сьледам за чыноўнікамі магістрату да галадоўкі далучыліся пэнсіянэры, служачыя пажарнай каманды і гарадзкіх больніц. Асабліва ўражаньне робіць галадоўка старых пэнсіянэраў, 60—70-гадовых, якія ў ліку 60 чалавек сабраліся ў памяшканьне прафсаюзу камунальных рабочых і там начуюць. Служачыя гарадзкіх больніц і пажарнай каманды праводзяць галадоўку, не пакідаючы сваіх устаноў. Прафсаюз камунальных служачых абвясьціў усеагульную забастоўку.

Друк паведамляе, што ўлада, каб забясьпечыць работу электрычных станцый і водаправоду на выпадак паўтарэньня забастоўкі, мабілізуе ваенныя атрады. Адначасова прэзыдэнт магістрату апублікаваў адозву, у якой пагражае галадаючым у выпадку працяваньня барацьбы ўжыць артыкулы ковага карнага кодэксу, якія прадугледжваюць 5 год катаржных работ за ўдзел у страйку на камунальных прадпрыемствах.

Газэта «АБЦ» у тэлеграме свайго спэцыяльнага горадзенскага карэспандэнта дае наступны малюнак галадоўкі.

«Уваходжу ў памяшканьне, дзе сабраліся пэнсіянэры, — піша карэспандэнт. — Яны ўсе сынуць у адным пакоі. Пры маім уваходзе ў мой бок паварочваецца некалькі сівых галоў жанчын і мужчын. На падлозе ляжыць салома, на якой пэнсіянэры начуюць. Нейкі 70-гадовы стары на маё пытаньне, ці доўга ён намеран галадаць, адказвае: «Пакуль не дабемся свайго. Замест галадоўкі дома, я лічу лепш праводзіць галадоўку тут, разам з усімі». У крэслах ляжаць пэнсіянэркі, напрытомныя ад зморанасьці».

Аналёгічныя малюнкі нагладаў карэспандэнт і сярод галадаючых служачых гарадзкой больніцы і пажарнай каманды.

Падпал авіябазы на Камчатцы

ХАБАРАЎСК 20. 19 студзеня на Камчатцы ў будынку Усьць-Бальшарэцкай базы грамадзянскага паветранага флёту адбыўся пажар. Расьсьледаваньнем было ўстаноўлена, што пажар узьнік ад падпалу і што будынак авіябазы быў падпален міліцыянэрам Трафімавым, які яго ахоўваў, пры ўдзеле другога міліцыянэра Прыгунова.

Падпал Трафімавым і Прыгуновым быў зроблен па ўказаньні кладаўшчыка мясцовага саўгасу—Селіванава, які аказаўся былым попом. Усе трое на допыце прызналіся ў сваім злачынстве і паказалі, што зрабілі злачынства па заданьні нейкага японца Кайзава, пражываючага ва Усьць-Бальшарэцку. Арыштаваны японец Кайзава пацьвердзіў паказаньне Селіванава і арыштаваных міліцыянэраў і прызнаўся, што яму было даручана нейкімі японцамі зьнішчыць як авіябазу ва Усьць-Бальшарэцку, так і рад іншых пабудоў, маючых важнае дзяржаўнае значэньне. Сьледзтва па гэтай справе працягваецца.

Біра-Біджан на экране

Па ініцыятыве трэсту Белдзяржкіно, кіно-фабрыка «Савецкая Беларусь» улетку 1932 г. паслала кіно-экспэдыцыю ў Біра-Біджан для здымку кіно-нарысу, які паказаў-бы жыцьцё працоўных яўрэяў у Біра-Біджане.

Брыгада складалася з 2-х рэжысэраў, 2-х апэратараў і асыстэнта. За тры месяцы ёю зроблен рад цікавых здымкаў з жыцьця і работы дрэваапрацоўчага камбінату, птушкасаўгасу каля станцыі Ціханькай, сьвінгасаўгасу, калгаса «Ікор», Сутарскіх залатых россыпяй і г. д. Зьняты матар'ял прынят 1 ўхвален дырэкцыяй фабрыкі. Брыгада рыхтуе кінонарыс у 3-х частках. Фільм знаходзіцца ў пэрыядзе мантажу.

Новая механізаваная пральня ў Менску

Канчатковы тэрмін пуску новай мэханізаванай пральні ў Менску ўстаноўлен Менскім гарсаветам 10 красавіка 1933 г. Новая пральня будзе абталявана машынамі і прыладамі, паводле апошняга слова пральнай тэхнікі. Усе працэсы работы будуць мэханізаваны.

Магутнасьць пральні 225 тон або 675 тысяч штук бялізны ў месяц. Пры пральні адкрываецца мэханізаваная фарбэрня магутнасьцю ў 30 тон у месяц. Кошт будаўніцтва пральні—звыш 500 тыс. руб.

ВЫПЛАЧАНА ВЫЙГРЫШАЎ НА 100 ТЫС. РУБ.

У сувязі з «днём пазыкатрымацеля» ашчадкасы Менску правялі масавую праверку выйгрышаў па аблігацыях. Толькі за 15 дзён выплачана выйгрышаў па дзяржпазыках каля 100 тыс. руб. Курсант менскай школы міліцыі выйграў 5 тыс. руб.

«Да дня пазыкатрымацеля» ашчадкасы Менску ў сярэднім выплачвалі выйгрышаў 1.500—2.000 руб., а ў часе кампаніі гэта сума даходзіла да 10 тыс. руб.

Паведамленьне

—ПК ЦКК КП(б)В паведамляе, што 28-ага лютага г. г., у 10 гадз. раніцы, у г. Менску (ЦКК КП(б)В) будзе працаваць выязная камісія ЦКК УсеКП(б) па разгляду апэляцыйных партспраў наступных т. т.: Бароўскі А. П., Барысук Ф. Р., Вячорскі І. М., Вараб'ёў А. Я., Гудкова В. А., Глушакоў Р. Р.; Гефцер А. А., Гарашэня Ц. Л., Губарэвіч Д. І., Зянькоў А. Т., Каган Г. Б., Клуйша Б. О., Конікаў С. І., Каллан Ю. П., Караткевіч П. К., Клопаў П. О., Крэсьлін М. А., Лорыр Г. Г., Лебедзеў Я. Е., Мазур К. І., Машко К. Ф., Мельнікаў П. А., Мілашэўскі Л. В., Майсеенка К. А., Мацыеўскі П. Я., Насевіч М. Ф., Адышец Л. К., Пупчыц Ф. Ф., Паўловіч А. П., Пэкер А. Х., Пусенко Я. М., Прахін В. А., Рамановіч К. Ц., Сталярчук П. І., Семенаў Б. К., Сьцепаненка Л. Р., Смоліч Е. О., Саракалетаў Ф. А., Стваліньскі М. В., Тэвелеў П. С., Пілпенка М. І., Хорошко І. Р., Шчэбелеў Г. С., Шыцко М. Д., Шэхтман М. М., Ястрэбскі М. М., Рыбакоў М. А., Іншукін К. К., Працько М. І., Мальта, Ткачэнка, Спрэйкіс І. Д., Садонік І, Грышкевіч В. І., Бедржыцкі В. В., Шатун І. Шамецько І., Шульман Я. Ѳ., Капітальнаў Н. Ф.

Яўка пералічаных таварышоў абавязкова. Праезд не аплачваецца. Выключаемыя таварышы павінны мець пры сабе водзывы ад партячэек аб сваёй апошняй рабоце.

Усебеларускі стадыён у дзень 15 гадавіны [illegible]

Ужо з 10 гадз. раніцы ў горадзе вялікае ажыўленьне. З усіх канцоў да стадыёну пацягнуліся стройныя калёны рабочых менскіх прадпрыемстваў, фізкультурнікаў, вайсковых часьцей.

На трыбуне стадыёну—прадстаўнікі цэнтральных і гарадзкіх партыйных, савецкіх і прафэсыянальных арганізацый. Тав. Башмачнікаў адкрывае ляпучы мітынг. Слова даецца старшыні СНК БССР тав. Галадзеду.

...Ад імя Цэнтральнага камітэту КП(б)В і Савету Народных Камісараў БССР вітаю пралетараў Менску, фізкультурнікаў і часьці Менскага гарнізону са слаўнай XV гадавінай Чырвонай армії.

...Усе нашы перамогі на фронце са цыялістычнага будаўніцтва—рэзультат паўхільнага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі, рэзультат геніяльнага кіраўніцтва вялікага правадыра партыі і рабочай клясы—тав. Сталіна.

...Мы мелі магчымасьць дабіцца вялізарных посьпехаў, дзякуючы таму, што наша будаўніцтва ахоўвала моцная ўзброеная апора пралетарскай дыктатуры — Рабоча-Сялянская Чырвоная армія...

Магутнае «ура» пакрывае апошнія словы прамовы тав. Галадзеда. Пасьля гэтага пачынаецца парад. Перад трыбунай прадэфілявалі тысячныя калёны пралетараў Менску, фізкультурнікаў, вайсковых часьцей.

Няхай жыве вялікі стратэг, правадыр сусьветнага пралетарыяту — тав. Сталін!

— Няхай жыве арганізатар і кіраўнік Чырвонай армії—усесаюзная камуністычная партыя!

Няхай жыве КП(б)Б і яе бальшавіцкі ЦК!

Дружным «ура» адказваюць калёны на гэтыя лёзунгі.

На сьвяце прысутнічаў сакратар ЦК КП(б)Б т. Шаранговіч, які разам з т. Галадзедам сачыў за ходам спаборніцтва.

С. Г.

ПАСТАНОВА № 5

Прэзыдыуму Менскага Гарадзкога Савету ад 21-II 1933 г.

Аб ходзе самазагатовак

1. Адзначыць зусім недавальняючае выкананьне пляну самазагатовак за IV кв. 1932 г. Па усіх каапэрацыйных арганізацыях гораду Менску сумарны плян у 926.410 руб. выкананы толькі на 245.442 руб., ці 26,5 проц. Па асобных прадуктах квартальны плян выкананы: па мясу — на 30,3 проц., птушцы — 12,9 проц., маслу — 14,4 проц., яйках — 6,2 проц., малаку — 15,2 проц.

Па Менскаму аддзяленьні Белгандлю плян IV кв. у 355.400 руб. выкананы на 185.766 руб., ці на 43 проц.

Оршанскі плян самазагатовак зусім сарваны. Паводле даных 8-мі ЗРК плян выкананы толькі на 1—2 проц.

2. Дрэннае выкананьне пляну самазагатовак тлумачыцца тым, што з боку каапэрацыйных і дзяржаўных арганізацый г. Менску (асабліва з боку старшыні ЗРК абутнікаў тав. Когана, ЗРК будаўнікоў тав. Мая, ЗРК ф-кі імя Крупскай тав. Ліса, ЗСК т. Вышнінскага) праяўлена бязьдзейнасьць у справе самазагатовак, недаацэнка важнасьці гэтай справы з боку трыкутнікаў прадпрыемстваў, засьмечанасьць апарату чужым гандлярскім элементам, ня адлежным па савецкі весьці гандлёвыя ўзаемадносіны з калгасамі і злачынь супраціўленьне бюратратычных элементаў, якія імкнуцца сарваць самазагатоўкі каапэрацыйных і дзяржаўных арганізацый.

Усё гэтае, што самазагатоўкі павінны складзці значныя дадатковыя крыніцы да цэнтралізаванага снабжэньня і тым карэнным чынам палепшыць снабжэньне рабочых, і ў мэтах упарадкаваньня самазагатовак Прэзыдыум Гарсавету пастанаўляе:

1. Для кіраўніцтва самазагатоўкамі, устанаўленьня і правядзеньня ў жыцьцё канвэнцыйных цэн, арганізаваць па гораду Менску і раёну канвэнцыйнае бюро ў складзе т. т. ТУРЭЦКАГА (нам. старшыні гарсавету), старшыні бюро, ГАНТМАН — нам. старшыні бюро, т. ШУЛЬКІНА (Гарпрафсавет), тав. ШЫЛОВІЧА (райпасгаўсаюз), т. ХАЗАНА (Гарфабкол), ДУВЭРШТЭЙНА (Мен. аддзел Белгандлю), т. ГОЛЬДЭНА (ЗРК абутнікаў), т. ГЕЛІНА (ЗРК «Камунар»), т. РОЗІНА (ЗРК імя Варашылава), тав. ДЭРМАН (гарміліцыя).

2. Абавязаць тав. ТУРЭЦКАГА не пазьней 23 лютага дабіцца замацаваньня з т. Менскам для вядзеньня самазагатовак наступных раёнаў БССР: Слуцкага, Смалявіцкага, Лагойскага, Менскага, Асіпавіцкага, Выкаўскага, Любаньскага, Заслаўскага, Чэрвуцкага і Кармянскага, прыгадаваць да іх асобныя гандлёвыя арганізацыі, абавязаўшы іх у 3-дзённы тэрмін выехаць у замацаваныя раёны і разгарнуць работу па самазагатоўках.

3) Абавязаць усе загатоўчыя арганізацыі гор. Менску (ЗРК, Гарфабкол, Белгандаль, прадпрыемствы, маючыя аддзелы рабочага забясьпячэньня і звыш 500 чал. рабочых) у 3-дзённы тэрмін прадставіць у канвэнцыйнае бюро пры гарсавеце (Пляц Волі № 4) пляны загатовак на 1 квартал гэтага году з указаньнем колькасьці (вагой) пасобных прадуктаў. Канвэнцыйнаму бюро апрацаваць гэтыя пляны і не пазьней 25-II ўнесьці на разгляд і зацьвярджаньне прэзыдыуму гарсавету.

4) Абавязаць канвэнцыйнае бюро да 22-II 1933 г. устанавіць па Менскаму раёну канвэнцыйныя цэны на ўсе сельска-гаспадарчыя прадукты, кіруючыся цэнамі цэнтральнай канвэнцыі і дырэктывамі па гэтым пытаньні калегіі СПА пры СНК БССР.

Даручыць інспэкцыі цэн гарКК і гарснабу ў дэкадны тэрмін устанавіць шкалу накладных выдаткаў на самазагатоўках.

6) Даручыць канвэнцыйнаму бюро і міліцыі прадукты, якія закупляюцца па цэнах, перавышаючых канвэнцыйныя, канфіскоўваць і вігаватых у парушэньні цэн прыцягваць да адказнасьці ў адпаведнасьці з пастановай ЦВК і СНК СССР (ад 22-VII—32 г. аб барацьбе са спекуляцыяй).

6) Катэгарычна забараніць прадпрыемствам і гандлёвым арганізацыям правесьці аталяваньне здатчыкаў прадуктаў па дэцэнтралізаваных загатоўках прадукцыі сваіх прадпрыемстваў. Вінаватых у парушэньні гэтага перадаваць суду, як за крымінальнае злачынства.

7) Катэгарычна забараніць вядзеньне дэцэнтралізаваных загатовак с.-г. прадуктаў на менскіх базарах і прыгарадным с-савеце. Нагляд за выкананьнем гэтага пункту пастановы ўскласьці на дырэктара базара тав. ГРЫБА, канвэнцыйнае бюро і міліцыю.

8) Вядзеньне дэцэнтралізаваных загатовак у саўгасах (прэставаных і непрэставаных) забараніць. Саўгасы павінны здаваць усю прадукцыю ў цэнтралізаваным парадку па ўстаноўленых цэнах.

9) Сельсаветы Менскага р-ну (за выключэньнем прыгарадных) замацаваць за пасобнымі гандлёвымі арганізацыямі і дазволіць ім весьці дэцэнтралізаваныя загатоўкі наступных прадуктаў: мяса, жывёла ўсіх відаў, рыба, масла, малако, сыр, птушка, дзічына, гародніна, садавіна, грыбы — усюды, за выключэньнем калгасаў і аднаасобнікаў, ня выкананўшых вышэйшай цэнтралізаваных загатовак.

10) Абавязаць усе каапэрацыйныя і дзяржаўныя арганізацыі гораду Менску праверыць свае загатоўчыя апараты, ачысьціць іх ад клясава-чужых элементаў і стварыць моцны, працаздольны загатоўчы апарат, які змог-бы па-баль шавіцку разгарнуць работу па самазагатоўках і поўнасьцю выканаць устаноўленыя пляны самазагатовак.

11) Абавязаць трыкутнікі прадпрыемстваў гораду Менску заблісьнічыць актыўны ўдзел у справе разгортваньня самазагатовак, ліквідаваць існуючую безадказнасьць па гэтай справе.

12) Абавязаць усе Менскія арганізацыі, дапушчаныя да самазагатовак, прадстаўляць гарсавету дэкадныя весткі аб загатоўках с.-г. прадуктаў у дзеньтралізаваным парадку, асобна па Менскаму раёну і асобна па іншых раёнах. Першыя зводкі за час з 1-I—33 г. па 20-II—33 г. павінны быць даданы 23-II—33 г.

13) Кантроль за выкананьнем гэтай пастановы ўскладаецца пад асабістую адказнасьць інспэктара КЛЯБАНАВА.

Старшыня Менскага Гарсавету ВАЛОДЗЬКА.
За сакратара ЯГОЎДЗІК.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ

ВЫ

КІНО-ТЭАТР ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА

Пачатак сэансаў: 5-30, 7-15, 9,—10-45

павінны абавязкова глядзець лепшы гукавы мастацкі фільм

ПЕРШЫ УЗВОД

З 26 лютага штодзённа перад кожным сэансам уступнае слова аўтара сцэнарыя т. БРОДЗЯНСКАГА

АДКРЫЦЬЦЁ 1, 2, 3 сакавіка | Дзяржаўны Яўрэйскі тэатр (Валадарскага, 7) | АДКРЫЦЬЦЁ 1, 2, 3 сакавіка

МЮЗІК-ХОЛ

гастролі ТЭА-ДЖАЗА БАРЫСА РЭНСКАГА

Штодзённа 2 выступленьні. Пачатак 1-га ў 3 г., 2-га у 10 г.

Білеты ў рабкасе і касе тэатру. Прымаюцца заяўкі на культпаходы.

Дзеці да 16 год не дапускаюцца.

Першы Дзяржаўны Тэатр (БДТ—I)

СЕНЬНЯ

А. Міровіч

ЛЁН п'еса ў 3-х дзеях

Пастаноўка заслуж. арт. рэсп. А. Міровіча і М. А. Зорава

Пачатак у 8 гадзін вечара.

Кіно СПАРТАК

З 26 лютага

Мастацкі фільм

КАУКАСКІ НЯВОЛЬНІК

Паводле раману ЛЕРМАНТАВА

Драма у 6 частках.

Штодзённа 5 сэансаў)—(Каса—з 1 г. дня

Чырвоная зорка | Гукавы фільм выт. Белдзяржкіно Першы ўзвод

Кіно ПРАЛЕТАРЫ | Мастацкі фільм Зьмеінае джала. Драма ў 6 части. Дзённыя дзіцячыя сэансы Асобная Далёка-Ўсходняя

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ | Мастацкі фільм ДЗЯРЖАЎНЫ ЧЫНОЎНІК

Каса—ад 12 г. дня

Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі | СЭКТАР КНІГАГАНДЛЮ

ВЫШЛА З ДРУКУ і рассылаецца ўсім падпісчыкам

Мастацтва і рэвалюцыя

№ 3-4 (1932 г.)

Масавая часопісь па пытаньнях тэатру, кіно, выяўленчага мастацтва і музыкі.

(Орган Галоўмастацтва і ЦП саюзу працмастацтва)

Цана асобнага нумару 1 р.

У зьмесьце:

І. І. Замоцін (акадэм.)—М. Горкі ў драматургіі і на сцэне.
А. Г. Радамовіч—БДТ-I да XV гадавіны Кастрычніка
М. ф. Рафальскі—Адказ мінстру Бяліку.
І. Цівунчык—Кінематаграфія БССР да XV гадавіны Кастрычніка.
Л. Гурэцкі—Аб самадзейным мастацтве.
Эд. Горскі—Творчы рост БДТ-III.
М. Аляхновіч і Стэльмах—Беларускі Дзяржаўны тэатр Рабочай Моладзі (ТРАМ).
ХРОНІКА і інш.

Часопісь багата ілюстраванымі фатаздымкамі.

ПАДПІСКА НА 1933 г. на «М.І Р.» ПРАЦЯГВАЕЦЦА.

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

На 12 м-цаў	18 р. —
„ 6 м-цаў	7 р. 50 к.
„ 3 м-ца	3 р. 75 к.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: ўсюды аддзяленьнямі і кіёскамі СЮЗДРУКУ, паштовымі агенцтвамі і лістаносцамі

АБВЕСТКА.

На падставе пастановы ЦВК і СНК БССР ад 20-III—32 году

аб парадку ўтрыманьня бруку, тратуараў і іх рамонце.

Будкантора Менкамгасу даводзіць да ведама ўсіх устаноў, жаўтаў і ЖСКТ, якія павінны будаваць пры сваіх дамаўладаньнях

ТРАТУАРЫ і БРУК,

ШТО ЯНЫ ПАВІННЫ

не пазьней 28 лютага г. г.

заключыць умовы з Будканторай Камгасу (Пляц Волі № 2) на вытварэньне паказаных работ.

Пасьля паказанага тэрміну ніякія работы Будканторай прымацца ня будуць.

Менкамгас.

Чэрыкаўскі вэтэрынарны тэхнікум

абвяшчае набор курсантаў на

9-месячныя вэтфэльчарскія КУРСЫ пры тэхнікуме.

На курсы прымаюцца асобы з адукацыяй у аб'ёме 5-6 груп сямігодкі. Курсанты забясьпечваюцца стыпэндыяй, інтэрнатам і сталоўкай. Да заявы далучаюцца дакументы аб сац. становішчы, аб адукацыі, узросьце, стане здароўя.

Тэрмін падачы заяў да 1-га сакавіка 1933 г.

Дакументы накіроўваць па адрасе: г. Чэрыкаў, Ветэхнікум.

Дырэктар Чэрыкаўскага Ветэхнікуму А. КАЗАК.

ВЫДАВЕЦТВУ „ЗЬВЯЗДА"

ПАТРЭБНА МАШЫНІСТКА

Зварачацца: Савецкая, 63, 2-гі паверх

СЁНЬНЯ у 6 гадз. вечара, у залі пасяджэньняў гарсавету (пляц Волі, 4, 3-ці паверх) адбудзецца

пасяджэньне пленуму Менскага гарадзкога савету

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Вынікі III сэсіі ЦВК СССР і IV сэсіі ЦВК БССР і задачы веснавой сяўбы (дакл. т. Чэрвяноў і Валодзька).
2. Даклад мандатнай камісіі (дакл. т. Пінхасік).
3. Арганізацыйныя пытаньні.

Яўка ўсіх членаў і кандыдатаў у члены гарсавету абавязкова

Прэзыдыум гарсавету

Пасяджэньне фракцыі КП(б)Б гарсавету

АДБУДЗЕЦЦА ў залі пасяджэньняў гарсавету

Сёньня, у 5 гадз. вечара

Яўка ўсіх членаў і кандыдатаў КП(б)Б—членаў гарсавету абавязкова

Фракцыя КП(б)Б прэзыдыум гарсавету

БЕЛКАНТОРА ДЗЯРЖБАНКУ

паведамляе,

што ўсе прадпрыемствы і ўстановы гор. Менску, якія не дапі

заявак на зарплату за першую палову лютага,

павінны прадставіць іх банку сёньня, 26 лютага.

Пасьля вызначанага тэрміну прыём заявак у лютым месяцы

БУДЗЕ СПЫНЕНЫ.

Дзяржбанк.

27 лютага у 7 з паловай гадз. веч. у памяш. Дому Асьветы адбудзецца

адкрыты ПАРТЫЙНА-КАМСАМОЛЬСКІ СХОД ячэйкі Працасьветы.

ПАРАДАК ДНЯ:

1) Справаздачы школ 18 і 28.

Запрашаюцца ўсе асьветнікі г. Менску

28 ЛЮТАГА.

у 7 гадз. вечара, у памяшканьні клюбу імя К. Маркса адкрываецца

ПЕРШАЯ ГАРАДЗКАЯ КАНФЭРЭН